Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛІПЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 129 (27987) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Ідэальны час для кватарантаў

СТАР. 4



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Тэст на бацькоўства: даведацца праўду

СТАР. 14

ЦЫТАТА ДНЯ



**Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ:**

*«Віцебск становіцца цэнтрам сусветнага фестывальнага руху, і гэта гонар для краіны. Работа «Славянскага базару» пачалася значна раней. Акрамя канцэртаў, праграма ўключае яшчэ і работу Сусветнай асацыяцыі фестываляў. Тое, што яе старшынёй выбраны Аляксандр Сідарэнка, вельмі добрая навіна не толькі для Віцебска, але і для ўсёй краіны, якая можа пахваліцца цэлай плеядай знакавых міжнародных фестываляў і конкурсаў, што традыцыйна арганізоўвае ў Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15460,00 | ▲ |
| Еўра | 17066,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,24 | ▲ |
| Укр. грыўня | 703,53 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X



Фота БЕЛТА.

# НАПРАМАК — ШМАТВЕКТАРНЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора падчас свайго рабочага візіту ва Уфу прыняў удзел у сустрэчы кіраўнікоў краін, што ўваходзяць у БРІКС, з лідарамі запрошаных дзяржаў для абмеркавання найбольш актуальных пытанняў сусветнай палітыкі, эканомікі, фінансавай сферы.**

«Мы даўно і паслядоўна прасоўваем ідэю «інтэграцыі інтэграцый» у сучасным свеце. Беларусь — гэта натуральны саюзнік БРІКС па пабудове ўзаемавыгадных і раўнапраўных адносін паміж Захадам і Усходам, Поўначчу і Поўднем без раздзяляльных ліній», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, выступаючы на сустрэчы.

«Беларусь можна смела прылічыць да членаў «клуба сяброў БРІКС «. Нам удалося выбудаваць узаемавыгадныя адносіны з усімі дзяржавамі аб'яднання», — падкрэсліў беларускі лідар.

СТАР. 2

# ПТУШКА ШЧАСЦЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



# У КОЛЕ СЯБРОЎ

**Учора вечарам сотні гледачоў у Віцебску і мільёны тэлегледачоў ва ўсім свеце ўбачылі цырымонію адкрыцця «Славянскага базару». У летнім амфітэатры разгарнулася сапраўды феерычнае дзейства. Канцэрт адкрыцця прайшоў «на адным дыханні» і пры поўным аншлагу.**

*Традыцыйна фестываль праходзіць пад патранатам кіраўніка нашай дзяржавы. Сёлета Аляксандр Лукашэнка не прысутнічаў на адкрыцці: якраз гэтымі днямі ва Уфе праходзілі саміты кіраўнікоў краін БРІКС і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (у апошняй, дарэчы, Беларусь атрымала статус назіральніка). Але без увагі Прэзідэнта госці і ўдзельнікі фестывалю не засталіся: пачулі ад яго цёплыя словы ў відэазвароце, які трансліраваўся на вялікім экране падчас адкрыцця.*

— Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь вельмі трапятліва ставіцца да «Славянскага базару ў Віцебску». Гэтае мерапрыемства стала ўжо знакавым святам не толькі для нашай краіны, — падкрэсліла віцэ-прэм'ер Наталля Качанава, старшыня арганізацыйнага камітэта «Славянскага базару».

— Я ганаруся тым, што мяне запрасілі быць старшынёй журы. І гэта, вядома, вялікая адказнасць, — гаворыць Палад Бюльбюль-аглы, старшыня журы фестывальнага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні. — Ваш фестываль, бадай, адзіны на постсавецкай прасторы, на якім можа заявіць пра сябе таленавіты пачатковец, у якога яшчэ няма сродкаў, каманды. Я пабываў у розных краінах свету. У Беларусі адчуваеш сябе ў коле сяброў. Я ўпэўнены ў поспеху гэтага фестывалю. Хочацца таксама пажадаць поспехаў канкурсантам і арганізатарам.

Сёння ўдзельнікі конкурсу маладых выканаўцаў выступяць у паўфінале. Беларуска Валерыя Грыбусава па выніках жараб'ёўкі атрымала апошні нумар, 21-ы па ліку. Таксама сёння будзе вядома, пад якімі нумарамі выступяць дзве юныя «зорачкі» ў дзіцячым конкурсе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

**(Працяг тэмы на 3-й стар.)**



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

**Старшыня журы фестывальнага конкурсу маладых выканаўцаў Палад Бюльбюль-аглы.**

# НАПРАМАК — ШМАТВЕКТАРНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таксама Аляксандр Лукашэнка правёў шэраг двухбаковых сустрэч, паведамляе БЕЛТА. У першы дзень саміту, як паведамляла «Звязда», адбылася сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. Як расказаў журналістам міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, «яна прайшла не проста ў канструктыўнай, а ў вельмі дружалюбнай, таварыскай атмасферы». Паводле яго слоў, на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна вялікая ўвага была нададзена развіццю гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння. «У палітычнай сферы і іншых у нас праблем няма. Пэўныя праблемы існуюць у сферы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Гэта звязана і з аслабленнем агульнасусветнай эканамічнай кан'юнктуры, і з узаемнымі санкцыямі паміж Расіяй і ЕС, — заявіў Уладзімір Макей. — Таму ў нас адбываецца спад тавараабароту ў гэтым годзе. На сустрэчы было абмеркавана, як пераадолець гэтыя негатыўныя тэндэнцыі і выйсці на той узровень тавараабароту, які быў у больш спрыяльныя гады».

Прэзідэнты Беларусі і Бразіліі Аляксандр Лукашэнка і Дзілма Русеф дамовіліся аб стварэнні нашымі дзяржавамі змешанай міжурадавай камісіі, якая вывучыць бягучы стан двухбаковых адносін і перспектывы паглыблення і пашырэння супрацоўніцтва па ўсіх напрамках. Кіраўнікі дзяржаў таксама дамовіліся, што будуць вызначаны ў найбліжэйшы час 4-5 асноўных напрамкаў, праектаў, якія бакі пачнуць рэалізоўваць і якія стануць прыкладам для далейшага развіцця адносін. Нягледзячы на тое, што тавараабарот паміж дзвюма краінамі дасягае амаль $1 млрд, прэзідэнты перакананы, што патэнцыял далёка не вычарпаны і бакам ёсць над чым працаваць. Як прыклад, дамова стварыць на тэрыторыі Бразіліі вытворчы кластар, дзе будзе выпускацца на сумесных прадпрыемствах сельскагаспадарчая тэхніка, вялікагрузныя аўтамабілі, трактары.

Аляксандр Лукашэнка запрасіў Дзілму Русеф наведаць з візітам Беларусь у любы зручны для яе час, і Прэзідэнт Бразіліі прыняла запрашэнне.

Падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Манголіі Цахіягійнам Элбэгдоржам, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што краіны не могуць быць задаволены існуючым узроўнем узаемадзеяння. «У нас ёсць чым гандляваць. Думаю, трэба арганізаваць на ўзроўні ўрадаў трывалыя групы, якія вывучылі б і прадставілі нам некалькі напрамкаў супрацоўніцтва, аж да канкрэтных праектаў», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на пастаўкі ў Манголію беларускіх вялікагрузных аўтамабіляў. У сваю чаргу Прэзідэнт Манголіі лічыць, што ў дзвюх дзяржаў ёсць шмат магчымасцяў для актывізацыі супрацоўніцтва. «Мы добра ведаем беларускія трактары, самазвалы, аўтамабілі БелАЗ. Раней у кожнай сям'і быў халадзільнік «Мінск», а жывёлаводы шырока выкарыстоўвалі матацыклы «Мінск», — сказаў Прэзідэнт Манголіі. Ён падкрэсліў, што Манголія — адна з тых азіяцкіх краін, дзе добра ведаюць беларускую прадукцыю, і прапанаваў беларускаму боку разгледзець пяць канкрэтных напрамкаў, па якіх краіны могуць развіваць далейшае супрацоўніцтва.

Беларусь гатова стварыць сумесныя вытворчасці ў Афганістане і выходзіць на рынкі трэціх краін. Аб гэтым ішла размова на сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Афганістана Аляксандра Лукашэнкі і Ашрафа Гані Ахмадзая.

Прэзідэнт Афганістана падкрэсліў, што ў яго краіне добра ведаюць беларускую тэхніку і маюць намер развіваць супрацоўніцтва праз далейшы гандаль і стварэнне сумесных вытворчасцяў.

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся пра стварэнне спецыяльнай групы, якая прапрацуе напрамкі ўзаемадзеяння, што цікавяць бакі, знойдзе агульныя падыходы, вызначыць магчымыя сумесныя праекты.

Беларусь таксама разлічвае на паглыбленне супрацоўніцтва з Іранам, пра што заявіў Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся ва Уфе з Прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Хасанам Раўхані. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што краіны перажылі вельмі складаныя часы ў двухбаковых адносінах, звязаныя са знешнімі прэтэнзіямі, санкцыямі, націскам. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Іран з поспехамі на міжнароднай арэне. «Я вельмі рады, што праходзяць гэтыя перагаворы, адкрываюцца добрыя перспектывы, звязаныя з новым Прэзідэнтам Ірана. І мы вельмі спадзяёмся на паглыбленне нашага супрацоўніцтва», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт Ірана ў сваю чаргу адзначыў зацікаўленасць у развіцці адносін з Беларуссю. «У нас як асабіста з вамі, так і з Беларуссю заўсёды складваюцца вельмі дружалюбныя адносіны», — сказаў ён.

■ Парламенцкі дзённік

# ПАСТАВІМ НА КОЛЫ

## Казахстан зацікаўлены ў нашай сельскагаспадарчай тэхніцы

**Пра гэта заявіў <u>старшыня камітэта па аграрных пытаннях Мажыліса Парламента Казахстана Ромін МАДЗІНАЎ</u> перад сустрэчай з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

«Вы ведаеце, што ў нас ужо адкрыта вытворчасць вашых трактароў. Гэта тэхніка запатрабавана таксама ў Сярэдняй Азіі. Акрамя таго, у Астане будзе пабудаваны сумесны завод па вытворчасці сельгастэхнікі. Нас цікавіць і ваш вопыт у галіне малочнай вытворчасці», — паведаміў Ромін Мадзінаў.

Пры гэтым **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Віктар ШЧЭЦЬКА** адзначыў, што Казахстан пацвярджае зацікаўленасць у беларускай сельскагаспадарчай тэхніцы. «Нам трэба ісці туды. Падчас наведвання Мінскага трактарнага завода з парламентарыямі з Казахстана мы будзем весці пра гэта размову. Казахстану таксама патрэбны камбайны, і неабходна працаваць у гэтым напрамку», — сказаў беларускі парламентарый.

Дарэчы, на думку Роміна Мадзінава, Беларусь і Казахстан павінны не канкурыраваць адно з адным, а шукаць агульныя падыходы, каб разам прадаваць прадукцыю за межы Мытнага саюза, нарошчваць свой тавараабарот: «Для гэтага дэпутаты павінны стварыць прававыя асновы і агучыць праблемы, каб урады дзвюх краін рухаліся далей».

Сёння тавараабарот паміж нашымі краінамі складае 1,2 млрд долараў. За 2014 год ён вырас на 21%. Казахстанскія калегі прагназуюць далейшы штогадовы прырост на ўзроўні 10%.

Парламенцкая дэлегацыя Казахстана знаходзіцца з візітам у Беларусі з 9 па 13 ліпеня. Парламентарыі наведаюць Мінскую агародninную фабрыку, Мінскі трактарны завод і Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**
*kuletski@zviazda.by*

# СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД

## У Савеце Рэспублікі абмеркавалі законапраект, які заклікаiы ўдасканаліць механізм прыняцця новых законаў

**Па сутнасці, праект Закона «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь», які члены прэзідыума верхняй палаты беларускага парламента абмяркоўвалі разам з яго распрацоўшчыкамі — прадстаўнікамі Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, патрэбны, каб пазбегнуць нелагічнасці, прабелаў, цяжкасці ўспрымання новых законаў, а таксама іх рэалізацыі.**

— Нягледзячы на тое, што многія пытанні ў заканатворчай дзейнасці ў нас урэгуляваны, патрэбны грунтоўны дакумент, які ўдасканаліць рэгламентацыю падрыхтоўкі, узгаднення, сістэматызацыю нарматыўных прававых актаў, — заўважыў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч. — У законапраекце ёсць вельмі цікавыя раздзелы, якія датычацца менавіта падрыхтоўкі нарматыўных прававых актаў. Яны накіраваныя на тое, каб добрыя ідэі не зводзіліся на нішто.

Акрамя таго, спікер звярнуў увагу на тое, што гэты законапраект павінен быць уніфікаваны з партнёрамі Беларусі па ЕАЭС. «Хоць у ЕАЭС парламенцкае вымярэнне само па сабе адсутнічае, гэта не значыць, што мы не павінны займацца пытаннямі законапраектнай дзейнасці», — сказаў ён і падкрэсліў важнасць гарманізацыі заканадаўства ў Еўразійскім эканамічным саюзе ўвогуле.

Дакумент устанаўлівае патрабаванні да лакальных прававых актаў, у прыватнасці ўводзіць забарону на ўключэнне у іх палажэнняў, якія пагаршаюць, у параўнанні з заканадаўствам, правы грамадзян і юрыдычных асоб. Таксама рэгламентуецца парадак афармлення абмежавальных грыфаў і грыфа сакрэтнасці ў праектах актаў, устанаўліваецца адзіная форма фінансава-эканамічных абгрунтаванняў, вызначаюцца крытэрыі адзнакі пры прагназаванні наступстваў прыняцця нарматыўнага прававога акта і іншае.

Чакаецца, што прыняцце гэтага дакумента дазволіць сістэматызаваць заканатворчую дзейнасць, у тым ліку праз спрашчэнне тэхнікі прыняцця законаў, публічнае абмеркаванне праектаў, прагназаванне наступстваў, ацэнку ўздзеяння новых законаў на бізнес-асяроддзе.

# БЕЗ КАНФРАНТАЦЫІ

**Учора ў Хельсінкі (Фінляндыя) завяршылася 24-я штогадовая сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ), у якой удзельнічала парламенцкая дэлегацыя Беларусі на чале з <u>віцэ-спікерам Палаты прадстаўнікоў Віктарам ГУМІНСКІМ.</u>**

Для беларускай дэлегацыі работа на гэтай сесіі пачалася з асуджэння, разам з шэрагам іншых дэлегацый, адмовы ва ўездзе на тэрыторыю Фінляндыі расійскіх калег, уключаючы Старшыню Дзяржаўнай Думы Сяргея Нарышкіна. Віктар Гумінскі заявіў пра непрымальнасць санкцый у міждзяржаўных адносінах, заклікаў да рэфармавання дзейнасці АБСЕ, уключаючы прыняцце Статута арганізацыі.

Віктар Гумінскі таксама падкрэсліў контрпрадукцыйнасць вынясення на разгляд хельсінскай сесіі любых праектаў рэзалюцый, якія не будуць садзейнічаць зблізжэнню пазіцый, пошуку кампрамісаў. У прыватнасці, ён заклікаў устрымацца ад канфрантацыйных заяў і рашэнняў, якія могуць перашкодзіць выкананню мінскіх дамоўленасцяў па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне.

На пачатку сесіі кіраўнікі парламенцкіх дэлегацый выбралі новага Генеральнага сакратара ПА АБСЕ. Ім стаў італьянец Раберта Мантэла, які прыступіць да выканання абавязкаў 1 студзеня 2016 года.

Беларускія парламентарыі актыўна ўдзельнічалі ў пленарным пасяджэнні асамблеі і пасяджэннях трох агульных камітэтаў ПА АБСЕ: па палітычных пытаннях і бяспецы; па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі; па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і гуманітарных пытаннях. Асамблея падтрымала шэраг беларускіх папраўак да праектаў рэзалюцый ПА АБСЕ.

Кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Гумінскі сустрэўся са старшынёй Парламенцкай асамблеі АБСЕ Ілкай Канервай. Падчас гутаркі былі абмеркаваны пытанні ўдзелу беларускага парламента ў дзейнасці асамблеі, шляхі ўрэгулявання сітуацыі ва Украіне і ўдзел асамблеі ў назіранні за выбарамі Прэзідэнта Беларусі. Прадметам размовы таксама сталі беларуска-фінляндскія стасункі.

Падчас работы сесіі беларускія парламентарыі сустрэліся з дэлегацыямі Азербайджана, Арменіі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грузіі, Італіі, Казахстана, Кыргызстана, Манголіі, Польшчы, ЗША, Таджыкістана, Украіны, Францыі, Чэхіі, Швецыі, Эстоніі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ У лічбавым фармаце

# ТЭЛЕВІЗАР — АМАЛЬ КАМП'ЮТАР

## ХУТКА ПРЫЙДЗЕ СТЭРЭАВЯШЧАННЕ І ШЫРОКАПАЛОСНЫ ІНТЭРНЭТ?

**У краіне плануецца актыўна ўкараняць дадатковыя сэрвісы пры трансляцыі агульнадаступнага пакета тэлепраграм. Пра гэта паведаміў <u>начальнік упраўлення электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Павел ПЕТРУЛЕВІЧ.</u>**

«Гаворка ідзе ў першую чаргу аб такіх сэрвісах, як EPG, або «электронны Тэлегід» (экраннае меню, якое адлюстроўвае расклад тэле- і радыёпраграм з магчымасцю інтэрактыўнай навігацыі кантэнту па часе, назве, канале, жанры і г.д. пры дапамозе пульта дыстанцыйнага кіравання), стэрэавяшчанне, пераход на фармат тэлевізійнага вяшчання з суадносінамі 16:9», — сказаў Павел Петрулевіч.

Паводле яго слоў, акрамя магчымасці ўкаранення сучасных тэхналогій тэлевяшчання і звязаных з ім дадатковых сэрвісаў, радыёчастотны рэсурс, які вызваліцца ў выніку адключэння аналагавага эфірнага тэлевяшчання (так званы лічбавы дывідэнд), можа быць выкарыстаны для ўкаранення і іншых сучасных тэхналогій і паслуг электрасувязі, у тым ліку для пашырэння паслуг мабільнага шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт.

«Адключэнне аналагавага эфірнага тэлевізійнага вяшчання дае магчымасць для развіцця іншых перспектыўных напрамкаў, мерапрыемствы па якіх будуць разгледжаны пры фарміраванні Праграмы развіцця нацыянальнай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры на 2016-2020 гады», — канстатаваў прадстаўнік Мінсувязі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.** *kuletski@zviazda.by*

■ Сусветны маштаб

# ААН ПАДТРЫМАЕ ІНІЦЫЯТЫВЫ МАЛАДЫХ

**Сёлета Арганізацыя Аб'яднаных Нацый адзначае сваё сямідзесяцігоддзе. Адной з дзяржаў, якія ў 1945 годзе ў Сан-Францыска падпісалі Статут ААН, стала БССР. З атрыманнем краінай незалежнасці Арганізацыя Аб'яднаных Нацый сур'ёзна пашырыла сваю дзейнасць у Беларусі. Учора ў сталічным бізнес-клубе IMAGURU прайшла цырымонія афіцыйнага прызначэння членаў Маладзёжнага консультацыйнага савета пры ААН (МКС ААН) у нашай краіне, што падкрэсліла тую ўвагу, якую ААН надае пытанням моладзі.**

У савет увайшлі 13 чалавек, якія прадстаўляюць самыя розныя катэгорыі моладзі: школьнікі, студэнты, маладыя спецыялісты.

— Усяго было пададзена каля 200 заявак, — расказала **супрацоўнік офіса Пастаяннага каардынатара ААН у Беларусі Дар'я МІРОНАВА.** — Хлопцы і дзяўчаты выбіраліся пасля разгляду іх матывацыйных лістоў, у якіх яны тлумачылі, чаму хочуць увайсці ў склад МКС. Мы імкнуліся, каб у Савеце былі прадстаўлены погляды людзей максімальнай колькасці ўзростаў, зняткаў і цікавасцяў. Важна, што яны прадстаўляюць інтарэсы не якой-небудзь арганізацыі, а свае ўласныя. Штогод склад МКС будзе напалову змяняцца, такім чынам мы зможам даць магчымасць выказаць свае ідэі яшчэ большай колькасці моладзі.

Новы орган будзе мець кансультатыўны характар. У яго абавязкі ўваходзіць прадстаўленне рэкамендацый арганізацыям сістэмы ААН па пытаннях моладзі, удзел у мерапрыемствах агенцтваў ААН. Гэта значыць, што члены савета будуць уцягнуты ва ўсе праекты агенцтваў арганізацыі (напрыклад, UNICEF), якія закранаюць маладзёжную сферу, прымуць удзел у іх планаванні. Аналагічныя структуры ужо існуюць у Шры-Ланцы, Непале і іншых краінах. Нядаўна МКС ААН запрацаваў ва Украіне.

— Рашэнні па ключавых сусветных праблемах нярэдка прымаюць людзі ў пінжаках — афіцыйныя асобы, — зазначыў **пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА.** — Пры гэтым недастаткова ўвагі надаецца думцы простых людзей, тым больш юных членаў грамадства. Ёсць старая прымаўка: старыя абвяшчаюць вайну, а маладым прыходзіцца змагацца. Сёння гэта ўсё яшчэ так. Праблема заключаецца ў тым, што дарослыя людзі хутка забываюць пра тое, як гэта — быць юным. Ім ужо незразумелыя страхі, хваляванні і перажыванні, звязаныя з гэтым складаным узростам. Мы спадзяёмся, што стварэнне Маладзёжнага кансультатыўнага савета ў Беларусі нагадае грамадству аб праблемах юных членаў соцыуму.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Надвор'е

# СПЯКОТА АБ'ЯВІЛА ТАЙМ-АЎТ

## Максімальная тэмпература паветра ў суботу складзе толькі плюс 22 градусы

**Сёння ўдзень на тэрыторыю Беларусі будзе пастунаць халаднаватая і няўстойлівая паветраная маса з прапіскай над Скандынавіяй. Спецыялісты Белгідраметцэнтра паведамляюць, што чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, калі ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах прагрымяць навальніцы.**

### ХОЛАД ПОЎНАЧЫ ЕЎРОПЫ

Прагназуецца заходні вецер, месцамі — моцны парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 14-20 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да 23 цяпла. Не будзе суперцёпла і ў выхадныя. Атмасферны ціск уначы будзе слаба расці, днём істотна не зменіцца. У наступныя двое сутак, 11-12 ліпеня, захаваецца халаднаватае ветранае надвор'е.

У суботу наша краіна трапіць пад уплыў франтальных раздзелаў і няўстойлівых паветраных мас, якія пастунаюць з паўночнага захаду Еўропы. Пройдуць дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Месцамі па паўднёвым захадзе краіны моцны парывісты вецер. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 8-13 цяпла, а максімальная ўдзень — плюс 15-22 градусы. У нядзелю тэрыторыя Беларусі трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску, а па паўночна-ўсходняй палове краіны будзе адчувацца ўплыў няўстойлівых паветраных мас. Месцамі, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы чакаецца 8-13 цяпла, а тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 17-22 градусы, па паўднёвым захадзе — да 24 цяпла.

### БУЛЬБА СПЯКОТУ НЕ ЛЮБІЦЬ

Пасля дажджоў запасы вільгаці ў глебе папаўняюцца галоўным чынам на паўднёвым усходзе Беларусі. Паводле апошніх візуальных назіранняў спецыялістаў Белгідраметцэнтра, у Гомельскай вобласці шэраг метэастанцый адзначыў добрае ўвільгатненне верхняга 10-сантыметровага пласта глебы. Увільгатненне глебы захоўваецца ў большасці раёнаў Віцебскай вобласці, у паўночна-заходняй частцы Мінскай, месцамі на поўначы Брэсцкай і на крайнім паўднёвым усходзе Магілёўскай вобласці.

Аднак сурёзныя дажджы былі не паўсюдна. Таму ў многіх паўднёва-заходніх раёнах і месцамі па ўсходнім рэгіёне краіны верхні пласт глебы застаецца сухім. Спецыялісты адзначаюць, што ў першы тыдзень ліпеня з прычыны глебавай засухі і высокіх тэмператур паветра ў Гомельскай, на поўдні і паўднёвым усходзе Мінскай абласцей метэастанцыі фіксавалі пагаршэнне стану кукурузы, бульбы і цукровых буракоў. У паўднёвай зоне і месцамі на захадзе краіны заўчасна пачалося паспяванне азімых збожжавых культур і яравога ячменю. Вільготнасць збожжа месцамі не перавышае 8-11%. У Гомельскай вобласці частку пашкоджаных збожжавых убіраюць на сянаж. Шэраг метэастанцый Віцебскай і Мінскай абласцей адзначылі палягание збожжавых культур ад ветру і лівневых дажджоў.

У найбліжэйшы час у сувязі з паніжэннем тэмпературнага рэжыму і запланаванымі ападкамі аграметэаралагічнае становішча на значнай тэрыторыі краіны палепшыцца. Аднак з прычыны нераўнамернага размеркавання ападкаў глебавая засуха ў шэрагу рэгіёнаў, асабліва на паўднёвым захадзе Беларусі, захаваецца.

**Тым часам**

*Крыху раней навукоўцы ўжо прагназавалі істотнае зніжэнне ўраджайнасці, што звязана з нястрымі ўмовамі надвор'я. Аднак сітуацыя мяняецца. Учора* ***першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід МАРЫНІЧ*** *абвергх інфармацыю пра рэзкае зніжэнне ўраджайнасці збожжавых у Беларусі. «Падзенне ўраджайнасці азімых збожжавых у нашай краіне сёлета будзе нязначным — на 2-2,5 цэнтнера», — упэўнены спецыяліст. Ён адзначыў, што цяпер аграрыі ўжо пачалі ўборку азімага ячменю. Паводле інфармацыі ведамства, на 9 ліпеня ўбрана каля 45% плошчаў. Там падзенне ўраджайнасці склала толькі 1,8 ц/га.*

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

## ПАЛЕССЕ ЦЕРПІЦЬ АД СПЯКОТЫ

**На Прыпяцкім Палессі некалькі раёнаў за сёлетні сельскагаспадарчы год так і не дачакаліся выратавальнай вільгаці. Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Сяргей Мятліцкі паведаміў, што ад засухі больш за ўсё пацярпелі Мазырскі, Ельскі, Нараўлянскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі, Жыткавіцкі і Акцябрскі раёны.**



— Ёсць надзея, што пэўны ўраджай будзе ў цэнтральнай і паўночнай частках вобласці: Добрушскім, Гомельскім, Веткаўскім, Чачэрскім, Рагачоўскім, Жлобінскім і Буда-Кашалёўскім раёнах. Тут усё ж праходзілі дажджы, ды і зямля больш урадлівая.

Такім чынам, на Гомельшчыне з 366 тысяч гектараў збожжавых культур да ўборкі захавалася 327 тысяч. Астатнія давялося перавесці на зялёныя кармы. Нягледзячы на тое, што апошнімі днямі пайшлі дажджы, яны не могуць істотна паўплываць на фарміраванне ўраджаю збожжавых. Толькі часткова — на позняя яравыя, крупяныя, а таксама кукурузу. Сяргей Мятліцкі адзначыў, што ў параўнанні з мінулым годам па збожжавых культурах ёсць вялікае адставанне:

— Мы чакалі, што можа быць засуха, бо ўмовы надвор'я для атрымання добрага ўраджаю бываюць звычайна раз на пяць гадоў. Цяпер мы рыхтуемся да сяўбы азімых збожжавых і рапсу, займаемся нарыхтоўкай кармоў. Усе раёны вобласці ўжо ўключыліся ва ўборку збожжавых, з тэхнікай і палівам праблем няма.

Што тычыцца гароднiны і бульбы, іх ураджай на Гомельшчыне хаця і не будзе занадта вялікім, але ж для забеспячэння насельніцтва яго хопіць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

## МАРЫХУАНА Ў ПАДУШЦЫ

Яна была знойдзена ў пункце мытнага афармлення «Брэст-Цэнтральны» менавіта ў такой схованцы ў адным з купэ цягніка Варшава — Мінск. Вага рэчыва раслiннага паходжання склала больш за 700 грамаў. Уладальнікам схаванага ад мытнага кантролю наркатычнага рэчыва, як было высветлена, аказаўся грамадзянін нашай краіны, які ехаў у тым самым купэ і, між іншым, адмаўляў сваю датычнасць да знойдзенага. Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, у дачыненні да пасажыра заведзена крымінальная справа за кантрабанду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# ВІЦЕБСК СТАЎ СТАЛІЦАЙ ФЕСТЫВАЛЯЎ

**<u>Аляксандр СІДАРЭНКА, кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»</u> пазаўчора быў выбраны старшынёй Сусветнай асацыяцыі фестываляў. Карэспандэнт «Звязды» павіншаваў Аляксандра Пятровіча і задаў яму некалькі пытанняў.**

***— Можна назваць нечаканасцю, а магчыма і сенсацыяй тое, што цяпер Віцебск — «галоўны горад фестываляў»?***

— Дырэкцыя фестывалю працавала ў гэтым кірунку як мінімум тры гады. Нездарма сёлета такі пашыраны міжнародны фармат «Славянскага базару ў Віцебску». Гэта вынік таго, што кожны год вядзецца вялікая работа з прадстаўнікамі розных краін свету. У нас з'яўляюцца новыя партнёры: па арганізацыі фестывальных праектаў, конкурсаў. Тое, што ў гэтым годзе на фестывалі прадстаўлена больш за 40 краін свету, кажа пра многае. І лічу, што гэта — заканамернасць... Людзі, якія пабывалі на фестывалі, пасля раз'язджаюцца па розных краінах свету і міжволі становяцца нашымі «пасланцамі», партнёрамі і калегамі. А ўсё дзякуючы таму, што ў іх прыемныя і пазітыўныя ўражанні. Яны імкнуцца зноў трапіць у Віцебск...

***— А дзе раней знаходзілася «штаб-кватэра» асацыяцыі?***

— Пры стварэнні асацыяцыі штаб-кватэра была ў Македоніі. Цяпер, з улікам таго, што мне даверылі кіраўніцтва, у Віцебску — у дырэкцыі фестывалю. Ужо абмяркоўваем перспектыўны план прамежкавых сустрэч членаў савета дырэктараў. Адпаведна вызначаем той аб'ём працы, якую неабходна правесці. У першую чаргу, працу ў СМІ. Я маю на ўвазе падрыхтоўку новага сайта. Ён ёсць, але мы ўжо бачым, як яго трэба развіваць...

Самае галоўнае, што ўсе члены асацыяцыі маюць непадробнае і шчырае жаданне працаваць сумесна. У нас агульныя інтарэсы, паколькі ўсе з'яўляюцца арганізатарамі шматлікіх міжнародных конкурсаў, якія праходзяць у розных краінах. І прынята рашэнне штогод збірацца ў нас, праводзіць выніковыя сесіі асацыяцыі.

***— Адпаведна на «Славянскім базары» стане больш пераможцаў конкурсаў іншых фестываляў?***

— Так. Атрымаць у якасці ўдзельніка свайго фестывалю пераможцаў іншых міжнародных конкурсаў — гэта перспектыва вельмі добрая. І той папярэдні адбор у рамках Сусветнай асацыяцыі, які неабходна праводзіць, несумненна паўплывае і на ўзровень міжнародных конкурсаў нашага фестывалю і ўвогуле на яго...

Дарэчы, сёлета на конкурсы выканаўцаў у Віцебск прыехалі яшчэ больш пераможцаў адборачных тураў, якія прайшлі ў многіх краінах. І мы ідзём да таго, каб у найбліжэйшы час, можа быць, праз год, або два ў кожнай краіне праходзіў адборачны тур...

***— Як, на ваш погляд, павінна развівацца асацыяцыя?***

— Аналагічных арганізацый існуе ў свеце некалькі, і яны аб'ядноўваюць фестывалі па прынцыпе кантынентаў і дзяржаў. Наша асацыяцыя адносна маладая, і ў ёй у асноўным прадстаўнікі славянскіх краін. Упэўнены, што ў найбліжэйшы час геаграфія ўдзельнікаў асацыяцыі будзе пашырацца. Пры гэтым мы не зацікаўлены ў колькасці, а гаворка ідзе толькі пра якасны адбор членаў. Толькі пасля папярэдняга адбору фестываль зможа трапіць у члены асацыяцыі. Гэта трэба рабіць для таго, каб фарміраваць станоўчы імідж асацыяцыі...

Прыемна, што кіраўнікі фестываляў — членаў асацыяцыі — лічаць «Славянскі базар» прыкладам таго мерапрыемства, таго ўзроўню, да якога трэба імкнуцца. І тое, што яны аб'ядналіся вакол «Славянскага базару ў Віцебску», — гэта таксама вельмі многа значыць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

**<u>Валерыя ГРЫБУСАВА, прадстаўніца Беларусі на Міжнародным конкурсе эстрадных выканаўцаў «Славянскі базар — 2015»</u>**

**— Я хацела нумар 12, але весь буду выступаць пад нумарам 21. Магчыма, гэта добры знак, хоць я і не веру ў магію лічбаў. Буду выступаць у самым канцы, таму варта запасціся цярпеннем і захаваць сваю энергію да канца. Але я ўпэўнена ў сваім матэрыяле і думаю, што ўсё пройдзе добра. Канкурэнцыя пакуль што не адчуваецца, таму што мы як адна вялікая сям'я і ўсе зараджаны атмасферай свята. Адна з канкурсантак нават падаравала мне манетку на ўдачу, можа, яна сыграе сваю ролю. Веру, што ўсё атрымаецца.**



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

■ І лес у смутку

# ГРЫБНОЕ ПАЛЯВАННЕ АДМЯНЯЕЦЦА



**Сухое і спякотнае надвор'е сёлета прымусіла сур'ёзна павárушыцца не толькі дачнікаў з палівам сваіх палеткаў. Няпростыя ўмовы надвор'я ў гэты сезон могуць істотна знізіць даходы цэлых сем'яў, якія традыцыйна ўжо «кормяцца» ад лесу. І <u>першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК</u> гэты прагноз пацвердзіў. Спецыяліст упэўнены, што разлічваць на добры ўраджай журавін сёлета не варта.**

Аматарам схадзіць па сапраўдныя грыбы таксама прыйдзецца пачакаць як мінімум да наступнага года, лічыць намеснік міністра. Анамальная спякота заўсёды ўплывае на ўраджай дзікарослай прадукцыі ў нашых лясах. Таму сёлета з гэтым сітуацыя складаная, але не крытычная. Спецыялісты лясной сферы фіксуюць нядрэнны ўраджай суніц і чарніц. «А вось па журавінах сітуацыя крыху іншая, бо за сухую вясну і першы месяц лета ўзровень грунтовых вод упаў, тарфяніскі сухія, таму з журавінамі будзе праблема», — сказаў Аляксандр Кулік.

А з грыбамі ўвогуле атрымліваецца поўнае фіяска, лічыць прадстаўнік Мінлясгаса: «Увесну вільгаці практычна не было, лета цалкам высушыла лясную падсцілку, таму з грыбамі, мабыць, прыйдзецца пачакаць да наступнага года».

Нарыхтоўваць і збіраць дзікарослыя ягады і грыбы можна на любых участках лясного фонду, за выключэннем тых, дзе гэты від лесакарыстання забаронены ці абмежаваны ў адпаведнасці з заканадаўствам. Так, напрыклад, нарыхтоўка і збор дзікарослых ягад і грыбоў у прамысловых мэтах забараняюцца ў лясах запаведнікаў і помнікаў прыроды; у лясах асабліва каштоўных участкаў ляснога фонду, якія маюць генетычнае, навуковае і гісторыка-культурнае значэнне; у гарадскіх лясах і лясах лесапаркавых частак зялёных зон; у курортных лясах, а таксама на тых участках ляснога фонду, якія вызначаны ў якасці глушцовых такавішчаў і ў радыусе 300 м вакол іх. Тэрміны пачатку нарыхтоўкі і збору ягад штогод вызначаюцца абласнымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Аляксандр Кулік нагадаў і пра тое, што пры нарыхтоўцы і зборы ягад і грыбоў трэба выконваць пэўныя правілы. У прыватнасці, забараняецца прымяняць розныя механічныя прыстасаванні, якія могуць пашкодзіць ягаднікі. Каб не пашкоджаць грыбніцу, грыбы трэба зразаць нажом на глебе ля асновы або асцярожна выкручваць без парушэння ляснога падсцілу. Разграбаць гэты подсціл (асабліва пры нарыхтоўцы лісічак) забараняецца.

Калі чалавек вырашыць на гэтыя правілы не звяртаць увагу і пачне «пацікаць браканьернічаць», то за такія парушэнні прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе папярэджання або штраф у памеры да 20 базавых велічынь. Дарэчы, ужо сёлета за падобныя дзеянні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 62 чалавекі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Рэгіён

# НОВЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ — НОВЫЯ РАБОЧЫЯ МЕСЦЫ

**Сёлета на Гродзеншчыне стварылі больш за 2 тысячы новых рабочых месцаў, а да канца года іх павінна быць каля 6 тысяч. Аб гэтым паведаміў журналістам у Ашмянах старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**

## НЕ ТОЛЬКІ РАСІЙСКІ РЫНАК

Сітуацыя ў прамысловасці няпростая, асабліва што тычыцца продажу прадукцыі на знешніх рынках. У прыватнасці з прычыны дэвальвацыі расійскага рубля значна скарацілася валютная выручка ад экспарту мясамалочнай прадукцыі. Шмат страцілі і праз забарону паставак у Расійскую Федэрацыю вырабаў са свініны. Хаця сітуацыя пачынае паляпшацца: для двух прадпрыемстваў Гродзеншчыны «Расельгаснагляд» нядаўна зняў гэтую забарону, і ёсць надзея, што так будзе і з іншымі. Адпаведна трэба павялічваць і сыравінны патэнцыял. У жніўні ў эксплуатацыю будзе ўведзена ферма на 27 тысяч парасят — па самых перадавых тэхналогіях. Там жа, у Карэліцкім раёне, аднаўляецца свінакомплекс. А ў Берастаўіцкім і Смаргонскім раёнах пачалі будаваць іх прыватныя інвестары.

Пры гэтым у экспарце нельга арыентавацца толькі на Расію, куды Гродзенская вобласць прадае 96-97% сваёй мяса-малочнай прадукцыі. Тым больш што расіяне ў сувязі з вядомымі санкцыямі зараз шмат інвестуюць у развіццё сваёй сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці.

— Таму ставім задачу дыверсіфікацыі нашых паставак, каб не залежаць толькі ад расійскага рынку, — зазначыў Уладзімір Краўцоў.

У прыватнасці кіраўнікі шэрагу перапрацоўчых прадпрыемстваў Гродзеншчыны накіраваліся на інвестыцыйны форум у кітайскую правінцыю Ганьсу. Гродзенскі мясакамбінат цяпер наладжвае продаж на азіяцкі рынак каўбасных вырабаў з ялавічыны.

## ІНВЕСТЫЦЫЙНЫМ ПРАЕКТАМ — ПАДТРЫМКА ЎЛАДЫ

Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што безумоўным прыярытэтам сёння з'яўляецца стварэнне новых рабочых месцаў. А гэта дасягаецца дзякуючы адкрыццю новых вытворчасцяў. Нядаўна завяршылася мадэрнізацыя адкрытага акцыянернага таварыства «Мастоўдрэў». Выпуск шклаваты (сучаснага экалагічнага ўцяпляльніка) наладзілі на шклозаводзе ў Бярозаўцы: раней яе імпартавалі, а зараз не толькі забяспечваем свой рынак, але і маем экспартныя магчымасці. У Ваўкавыскім раёне арганізавалі імпартазамяшчальную вытворчасць фруктовых напаўняльнікаў для ёгуртаў, хлебапякарнай і кандытарскай прамысловасці — стварылі каля 100 рабочых месцаў. Больш за тое, яна «цягне» за сабой развіццё адпаведнай сыравіннай базы — вырошчванне садавіны, збыт якой будзе гарантаваны.

— Штотыднёва разглядаем у аблвыканкаме ход рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, існуючыя праблемы і шляхі іх вырашэння, — кажа Уладзімір Краўцоў.

Дарэчы, перспектывы працаўладкавання звязаны не толькі з прамысловасцю, але і іншымі сферамі. Напрыклад, нядаўна на Дзятлаўшчыне ў партнёрстве з расійскім інвестарам пабудавалі санаторый, дзе створана больш за 100 рабочых месцаў — не толькі для медыцынскага персаналу, але і для мясцовых жыхароў, якія будуць там гатаваць ежу, прыбіраць, выконваць іншую работу.

Важным інвестыцыйным накірункам Уладзімір Краўцоў таксама лічыць удзел у праграмах трансгранічнага супрацоўніцтва. Прыклад тут паказвае Ашмяншчына, дзе за апошнія тры гады на ажыццяўленне розных праектаў атрымалі ад Еўрапейскага саюза каля 1 мільёна еўра. У прыватнасці нядаўна адкрылі стадыён з трыбунамі на 500 месцаў, футбольным полем, бегавымі дарожкамі, зонай для кідання ядра. Гэты аб'ект пабудавалі дзякуючы праекту міжнароднай тэхнічнай дапамогі, дзе партнёрамі сталі Ашмянскі райвыканкам і ўпраўленне гміны Сувалкі (Польшча).

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## ЗА ЦЯПЛО ПЛАЦІЦЬ ВЫКЛЮЧНА ПА ЛІЧЫЛЬНІКУ

### Прынамсі тым, у каго яны ёсць

**У жыллёвым сектары прапануецца зрабіць абавязковай плату за цяпло па індывідуальных лічыльніках. Начальнік аддзела арганізацыйна-прававой работы дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віталь КРЭЦКІ паведаміў, што адпаведнае змяненне прапануецца прапісаць у новай рэдакцыі Дырэктывы №3 аб эканоміі і беражлівасці.**

Спецыяліст удакладніў, што калі ў доме ёсць індывідуальныя прыборы ўліку цяпла, то спажыўцоў могуць абавязаць ажыццяўляць разлік менавіта па іх. Гэта прапанова ўнесена ў праект дакумента. Тут трэба адзначыць той факт, што прыборы індывідуальнага ўліку цеплавой энергіі ставяцца ва ўсіх новых жылых дамах з 2004 года. Аднак жыхары павінны самі вызначыць, ці будуць яны плаціць па паказчыках індывідуальнага лічыльніка цяпла ці групавога. Вось тут узнікаюць пэўныя нюансы, бо для абслугоўвання разлікаў па індывідуальных лічыльніках трэба заключыць дагавор з разліkova-сэрвіснай арганізацыяй. Складаецца ён з жылым домам у асобе ўпаўнаважанага, а не з жыхарамі асобных кватэр. Таму плаціць за цяпло па індывідуальных лічыльніках можна ў тым выпадку, калі такое рашэнне будзе задавальняць большасць жыхароў дома.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Жыллё маё

# ІДЭАЛЬНЫ ЧАС ДЛЯ КВАТАРАНТАЎ

### Менавіта ў найбліжэйшыя 4-5 тыдняў на рынку сталічнай арэнды будзе назірацца максімум прапановы

**Лета ў поўным разгары. Усе адпачываюць, або амаль усе. Аднак гаспадары свабодных і «лішніх» кватэр сутыкнуліся з праблемай празмернасці прапановы і рэзкім недахопам кліентаў.**
**У такой сітуацыі галоўнымі фігурантамі, якія рэальна паўплываюць на фарміраванне цэннікаў на рынку, з'яўляюцца патэнцыяльныя кватаранты. Да традыцыйнага восеньскага ажыўлення яшчэ далёка, таму кошты на здымнае жыллё працягваюць зніжацца. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку доўгатэрміновай арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла спецыяліст аддзела жыллёвай арэнды цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Алена АГРЫЗКА.**

## ПАЛЯВАННЕ НА КЛІЕНТАЎ

Тэндэнцыя на патаненне прыватнай арэнды (у доларавым эквіваленце) у нашай краіне пачала акрэслівацца яшчэ ў пачатку года, калі звычайна валютныя цэннікі на здымнае жыллё істотна падаражэлі ў рублях. Аднак за гэты час нават рублёвыя даходы ў сярэдняга класа жыхароў Мінска істотна не павялічыліся. Зімой памер арэнды ў валюце зніжаўся не так моцна, як таго патрабаваў рынак.

Таму да вясны даволі істотная частка кліентаў без уласнага жылля з'язджала, бо не магла знайсці агульную мову з уласнікамі. Потым такія свабодныя памяшканні ўвогуле стаялі «на прыколе» і не прыносілі гаспадарам прыбытку. Ужо ў пачатку лета і цэннікі ў падобнага жылля пачалі зніжацца. А гэта прывяло да таго, што ў сталіцы сёння назіраецца другая масавая хваля пераездаў арандатараў. Не, яны не вярталіся назад у кватэры бацькоў ці ад'язджалі ў свае невялікія гарадкі і вёскі. «Прасунутыя» кватаранты актыўна мянялі не вельмі ліквідныя і дарагое жыллё на больш якаснае і таннае.

**З другой паловы жніўня і ажно да сярэдзіны верасня ў сталіцы чакаецца традыцыйнае павелічэнне актыўнасці патэнцыяльных кватарантаў.**

Сітуацыя для ўладальнікаў свабодных квадратных метраў ускладняецца цяпер яшчэ і тым, што на прыватным рынку назіраецца актыўнае развіццё кампаньёнства сусім незнаёмых людзей і сем'яў. Калі раней кожная маладая сям'я ці пара жыла абавязкова ў асобнай кватэры, то зараз сучасная моладзь усё часцей ставіцца да гэтага некрытычна. Сёння ў прасторнай трохпакаёвай кватэры могуць беспраблемна жыць адразу дзве ці нават тры бяздзетныя сям'і. А ў гэтым выпадку колькасць свабодных кватэр павялічваецца. Гаспадары без дадатковага прыбытку нервуюцца і згаджаюцца на істотныя зніжкі.

## З'ЯВІЛІСЯ АДНАПАКАЁЎКІ І ЗА 200 ДОЛАРАЎ

Заўважу, што кватэры з такім мінімальным коштам з'яўляюцца на сталічным рынку арэнды толькі ў адзінкавых выпадках менавіта ў старых дамах Заводскага раёна і ў Шабанах. Па такім кошце магчыма адшукаць пустыя аднапакаёўкі і ў зусім новых мікрараёнах у новабудоўлях. Прапанова жылля па такім кошце мінімальная, але і ў гэтым выпадку кліенты ставяцца да кватэр крытычна — зусім слабенькія на якасці кватэры попытам амаль не карыстаюцца.

Кватэры з поўным наборам стандартнай мэблі ў звычайных пяціпавярховых дамах і ў не вельмі маладых панэльках прапануюцца ўжо за 250-300 долараў. Калі аднапакаёвая кватэра мае прапіску недалёка ад лініі метро і па якасці яна апавядае сапраўды ўтульнаму жыллю, тады мінімальны цэннік такога жылога памяшкання складае ўжо 300 долараў і нават больш. Аднак звычайныя аднапакаёўкі па кошце звыш 350 долараў аўтаматычна трапляюць у ранг «вісякоў», на якія цяпер ніхто не звяртае ўвагі.

## СУСТРАКАЮЦЦА ДВУХПАКАЁЎКІ ЗА 300 «ЗЯЛЁНЫХ»

Па такім кошце сёння кліенту прапануюць толькі сціплую кватэру з маленькай агульнай плошчай і мэбляй савецкіх часоў. Сярэдні цэннік бюджэтных двухпакаёвак для людзей без вялікіх патрабаванняў складае ад 340 да 360 долараў. Сёння на прыватным рынку сталічнай арэнды існуе дастатковая колькасць якасных двухпакаёвых кватэр з цэннікам і за 400-450 долараў. Тут кліент павінен разумець, што гэта менавіта стартавы кошт прапановы, а пасля рэальных перамоў гаспадары пачынаюць выкарыстоўваць сапраўды гнуткую цэнавую палітыку. Канчатковыя зніжкі могуць дасягаць нават 50 і 100 долараў.

**Сёння ў прасторнай трохпакаёвай кватэры могуць беспраблемна жыць адразу дзве ці нават тры бяздзетныя сям'і.**

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што цяпер назіраецца самы ідэальны для патэнцыяльных кватарантаў час, калі менавіта яны з'яўляюцца «генераламі» становішча.

## ШМАТПАКАЁЎКІ — ПА КОШЦЕ МАЛЕНЬКІХ КВАТЭР

Спадарыня Агрызка паведамляе, што мінімальны попыт на ўсе віды кватэр наймацней за ўсё падкарэктаваў цану арэнды трохпакаёвых кватэр. Цяпер у каталогу прапановы існуюць нават такія варыянты, калі новыя шматпакаёвыя кватэры з будаўнічай апрацоўкай у новабудоўлях выстаўляюцца за 300 долараў. Падобныя мінімальныя цэннікі на такое жыллё пачалі з'яўляцца і ў старых дамах Курасоўшчыны. Сярэдні кошт арэнды трохпакаёвых кватэр у спальных мікрараёнах складае 350-400 долараў. Добра «ўпакаваныя» трохпакаёўкі з сучаснай мэбляй, поўным наборам амаль новай бытавой тэхнікі будуць каштаваць сёння ад 450 да 600 долараў. Прыкладна па такім кошце цяпер прапануюцца стандартныя трохпакаёвыя кватэры ў цэнтры сталіцы.

Даволі сур'ёзна тэндэнцыя на патаненне закранула і элітнае жыллё.




Паводле інфармацыі нашага эксперта, за апошнія чатыры месяцы арэнднае жыллё гэтай катэгорыі патаннела ў сярэднім на 20-30%. Сустракаюцца сёння і больш моцныя патанненні. Напрыклад, у каталогу ёсць шыкоўныя кватэры, якія яшчэ ў лютым здаваліся за 1,5 тысячы долараў. А цяпер іх не арандуюць нават за тысячу. Калі арэнднае жыллё каштавала каля 1 тысячы долараў, то цяпер яно выстаўляецца за 700-750 долараў.

## ПАТАННЕННЕ — ДА СЯРЭДЗІНЫ ЖНІЎНЯ

Наконт таго, што на працягу ўсяго ліпеня кошты на прыватную арэнду будуць зніжацца, Алена Агрызка ўпэўнена на ўсе 100%. Прапанова зашкальвае, а кліентаў амаль няма. І на працягу месяца колькасць свабодных кватэр будзе павялічвацца. Часткова гэта тлумачыцца зніжэннем заробкаў у буйным сеткавым гандлі. А апошняе масавае часовае закрыццё буйных аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання (толькі ў сетцы «Дабраном» у сталіцы закрылі дзясяткі магазінаў) пакіне іншагародніх работнікаў без заробкаў, на якія магчыма здымаць жыллё. Змянілася сітуацыя і на рынку працы, дзе апошнія ўрадавыя рашэнні аб дармаедах прымусілі «свабодных мастакоў» Мінска актыўна шукаць працу. А мясцоваму работніку здымнае жыллё не патрэбна. Гэта пра ліпень.

Потым прыйдзе пачатак жніўня, калі ў сталіцы будзе шмат абітурыентаў. Частка з іх (у каго дастаткова балаў для паступлення) разам з бацькамі пачне шукаць здымнае жыллё. Месцаў цяпер у сталічных інтэрнатах быццам бы хапае, але асобным катэгорыям маладых іншагародніх студэнтаў цяпер будуць тэрмінова патрэбныя кватэры, якія могуць разглядаць вобласці маладога ўзросту з сельскіх рэгіёнаў. Менавіта ў першую дэкаду жніўня ў другасным рынку арэнды сталічнага жылля максімум прапановы яшчэ захаваецца, аднак цэны на здымнае жыллё памяншацца ўжо не будуць, бо попыт пачне павялічвацца.

**Звычайныя аднапакаёўкі па кошце звыш 350 долараў аўтаматычна трапляюць у ранг «вісякоў», на якія цяпер ніхто не звяртае ўвагі.**

## АЖЫЯТАЖУ НЕ БУДЗЕ

З другой паловы жніўня і ажно да сярэдзіны верасня ў сталіцы чакаецца традыцыйнае павелічэнне актыўнасці патэнцыяльных кватарантаў. Здымныя кватэры пачнуць шукаць не толькі студэнты, але і новыя маладыя спецыялісты, якія вырашаць застацца ў Мінску. Верагодна, што ў гэты перыяд цэннікі на стандартнае і бюджэтнае арэнднае жыллё могуць крыху павялічыцца ў параўнанні з мінімальнымі коштамі ў ліпені. Пра тое, як моцна яны могуць павялічыцца, казаць пакуль рана. Згодна з папярэднім прагнозам экспертаў гэтай сферы, сярэдні тарыф арэнды на стандартную аднапакаёўку можа скласці ад 280 да 320 долараў, а звычайныя двухпакаёўкі трапяць у цэнавы дыяпазон ад 350 да 400 долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Ілья КОЛАСАЎ:

# «У МІНСКУ МНЕ ЛЁГКА ДЫХАЕЦЦА»

**Нядаўна ў праграме «Контуры» на АНТ з'явіўся новы вядучы. Ім стаў Ілья Коласаў, якога ў Беларусі, магчыма, ведаюць тыя, хто цікавіцца расійскім тэлебачаннем, у прыватнасці маскоўскім тэлеканалам «ТВ Цэнтр». Там наш герой працаваў доўгі час у інфармацыйных праграмах. Таксама ён вядомы як аўтар дакументальных фільмаў. Перыяд з 1987-га па 2000-ны адзначаны ў яго біяграфіі працай на радыё. А цяпер у яго жыцці пачаўся новы перыяд. Мы вырашылі пазнаёміцца з новым вядучым адной з самых папулярных праграм асабіста і даведацца больш пра тое, што прывяло яго на тэлебачанне і як ён пачувае сябе ў новай якасці...**



## СВАБОДА, ЯКАЯ ПРЫЕМНА ЗДЗІЎЛЯЕ

***— Ці даўно вы ў Беларусі і што стала таму прычынай?***

— Я тут ужо каля двух месяцаў. Кропку ў былым жыцці я паставіў не толькі ў Расіі, але і ў Германіі, дзе прапрацаваў год. Усё ішло да таго, што апынуўся ў беларускай сталіцы, бо мы абмяркоўвалі пытанне майго працаўладкавання на АНТ. Але паколькі своечасова не паступіла адказу ад кіраўніцтва тэлеканала (згадзіцеся, запрасіць чалавека збоку на адну з найважнейшых праграм — даволі сур'ёзны крок), то я з'ехаў на працу ў Берлін. Там я ўзначальваў Еўрапейскае бюро тэлекампаніі RTVi (яна працуе на замежнае вяшчанне на рускай мове). А потым мы зноў вярнуліся да гэтай размовы, і вось пытанне вырашана.

***— Вам падабаецца ў Мінску?***

— Раней бываў тут неаднойчы і канстатаваў як сабе, так і іншым, што ў вашым горадзе мне лёгка дыхаецца. І я часам думаў, як было б добра пераехаць сюды на пастаяннае месца жыхарства. Вось і прыехаў.

***— Як вас прынялі ў новым калектыве? Наколькі мне вядома, на месца вядучага праграмы «Контуры» вы былі не адзіным прэтэндэнтам...***

— Праўда? Я нават не ведаў. Мне далі магчымасць запісаць пілот, я яго зрабіў — і ўсё на тым. Упэўнены, канкурэнты ў мяне былі годныя, але я рады, што ўсё вырашылася на маю карысць... Людзі ў калектыве проста цудоўныя. Мне аказалі цёплы прыём, і ўсе гатовы дапамагаць. Я ўбачыў людзей, гатовых да супрацоўніцтва.

***— Калі вы яшчэ працавалі на праграме «25 гадзіна», то вас неаднойчы ў інтэрв'ю пыталі пра свабоду слова, свабоду творчасці. Якія цяпер адчуванні ў гэтым сэнсе?***

— Праграма «Контуры» — адна з самых важных на тэлеканале. Тэмы выпуску мы абмяркоўваем на лятучках. Але ў любой сур'ёзнай кампаніі існуе рэдакцыйная палітыка, таму я не магу выйсці і гаварыць усё, што мне ўздумаецца, у эфіры Другога нацыянальнага тэлеканала. Вырашаючы, якія тэмы і сюжэты з'явяцца ў новым выпуску, слухаем прапанову кожнага і потым рухаемся ў вызначаным кірунку. Што датычыцца свабоды слова і свабоды творчасці, то я быў прыемна здзіўлены, бо на тэлеканале ёсць тое, чаго нельга ўявіць у Расіі нават на рэгіянальным тэлебачанні. Тут сапраўды можна крытыкаваць, выказваць свае пункты гледжання... Ёсць магчымасць абгаворваць з кіраўніцтвам тэзісы, якія першапачаткова не планаваліся да эфіру, і цябе не проста выслухаюць — да цябе прыслухаюцца. Узяць тую ж тэму палітыкі, калі да выбараў засталося тры месяцы...

***— Я чытала, што вы сімпатызуеце кіраўніку нашай дзяржавы...***

— Так, прычым даўно. Па-першае, ён спікер нумар адзін на прасторы былога Савецкага Саюза. А па-другое, якія ў яго арганізатарскія якасці! Беларусь — гэта тая рэспубліка, якая здолела захаваць усе плюсы таго, што было да распаду СССР, і зрабіць сваю краіну лепшай. Не дазволіўшы жуллю і зладзеям пашкамутаць яе. Гэта заслуга Аляксандра Лукашэнкі... Мне падабаецца, што, працуючы ў Беларусі, не трэба заключаць пагадненні з уласным сумленнем. Гэта дае пачуццё душэўнага спакою. Яно, магу вас запэўніць, дарагога каштуе.

## ЖЫЦЦЁ — КАМПРАМІС І ІДЭАЛ НЕДАСЯЖНЫ

***— Наогул, ці часта з вамі здараліся сітуацыі, калі даводзілася ісці на пагадненні з уласным сумленнем?***

— Калі вы чыталі Даўлатава, то памятаеце яго зборнік апавяданняў «Кампраміс». Жыццё і ёсць той самы кампраміс. Не бывае ідэалу, мы толькі імкнёмся да яго, як да небасхілу, і, набліжаючыся, губляем. Што датычыцца, напрыклад, перыяду працы на тэлеканале «ТВ Цэнтр» (я туды прыйшоў у 2000 годзе), то першыя некалькі гадоў было нармальна, а потым прэсінг стаў павялічвацца. І, безумоўна, пратрымаўшыся там да 2013 года, мне даводзілася ісці на дамоўленасці з уласным сумленнем. Хоць я пераконваў сябе, быццам між радкоў выказваю тое, пра што іншыя не кажуць увогуле. Аднак гэта было толькі самасупакаенне. Таму цяпер рады, што своечасова паставіў ва ўсім кропку.

***— Восенню вы будзеце адзначаць 45-годдзе. Якія галоўныя ўрокі засвоілі за гэты час?***

— Толькі адно — да ўсяго, што з вамі адбываецца, трэба ставіцца спакойна. Жыццё доўгае і які б этап вы ні перажывалі, аднойчы ён пройдзе. Вы потым будзеце калі не смяяцца ад душы, то ўсміхацца, калі ўсё застанецца ззаду. Я рэаліст. Так, часам цёмная паласа доўжыцца год, а то і некалькі, але аднойчы вы прачынаецеся і працягваеце жыць.

***— На колькі гадоў вы сябе адчуваеце?***

— Умоўна кажучы, у 36 я адчуваў сябе 50-гадовым, а цяпер — нібы мне толькі 30. Усё мяняецца ў сілу жыццёвых абставін. У залежнасці ад таго, хочацца табе жыць ці не. Калі ўсялякае жаданне адсутнічае, то і адчуваеш сябе так, быццам твой цыкл завершаны. Што тут яшчэ рабіць? Потым у адно імгненне ўсё становіцца па-іншаму і ты думаеш: якое прыгожае мінскае неба, як тут цудоўна! І табе зноў 30!

***— Скажыце, акрамя працы на тэлебачанні, ці плануеце яшчэ нешта рабіць?***

— Калі ёсць патэнцыял, то яго варта рэалізоўваць. Мы з кіраўніцтвам АНТ размаўлялі пра тое, што можна яшчэ нешта зрабіць. Напрыклад, пры неабходнасці мяне можна выкарыстоўваць у якасці апаратыўнага каментатара. Паўтаруся, толькі пры неабходнасці, таму што на тэлеканале працуе шмат таленавітых людзей, якія добра ведаюць сваю справу. І была, на мой погляд, правільная прапанова зрабіць штосьці на радыё. Як мне здаецца, у Мінску не хапае інфармацыйнага радыёвяшчання, за выключэннем хіба што Першага канала нацыянальнага радыё. Мне з раніцы, калі саджуся ў машыну, цікава было б паслухаць нейкае ток-шоу, падключыцца да абмеркавання актуальных навін... І раз ёсць такая ніша, то трэба і гуляць на гэтым полі. Аднак я толькі агучваю тое, што існуе пакуль на ўзроўні ідэі, а як усё вырашыцца — пытанне не да мяне.

**«Да ўсяго, што з вамі адбываецца, трэба ставіцца спакойна. Жыццё доўгае і які б этап вы ні перажывалі, аднойчы ён пройдзе. Вы потым будзеце калі не смяяцца ад душы, то ўсміхацца, калі ўсё застанецца ззаду. Я рэаліст. Так, часам цёмная паласа доўжыцца год, а то і некалькі, але аднойчы вы прачынаецеся і працягваеце жыць».**

***— Па прафесіі вы гукарэжысёр. Як жа апынуліся ля мікрафона?***

— Перыяд працы за гукарэжысёрскім пультам быў нядоўгім. Цяпер нашмат утульней адчуваю сябе ў кадры. Да мікрафона я сеў аднойчы пасля таго, як вельмі захацелася выказацца, аналізуючы ўсё тое, што адбывалася ў краіне. Напісаў разгорнуты каментар і зачытаў яго ў студыі. Пасля таго выпадку мне сказалі, быццам я нарадзіўся з мікрафонам. Тады пачаў сумяшчаць працу гукарэжысёра і радыёвядучага, а з часам стаў галоўным зменным рэдактарам і ад пульта адышоў.

***— А чаму выбралі такую прафесію?***

— У 10 класе я не разумеў наогул, кім хачу быць, чым займацца па жыцці. Думаю, большасць у тым узросце не ведае, куды пайсці вучыцца. Я вырашыў падысці да пытання матэматычна, запытаўшы самога сябе, у чым я адчуваю сябе ўпэўнена. Нармальна ішла матэматыка, і ў мяне быў добры слых, таму, супаставіўшы два гэтыя факты, вырашыў пайсці вучыцца на гукарэжысёра. Тады іх рыхтавалі толькі ў Ленінградскім інстытуце кінаінжынераў, а ў Маскве быў філіял, куды я і паступіў.

***— Аналізуючы свой прыход на ТБ, ці вылучаеце кагосьці з тых, хто паспрыяў вашаму станаўленню як прафесіянала?***

— Сваім настаўнікам у журналістыцы я лічу Валерыя Горкіна-Магіцкага. Ён працаваў у нас у інавяшчанні на «Голасе Расіі». Бывала, ішлі мы з ім па калідоры, і тут Валерый Аляксандравіч спыняўся і пачынаў з некім размаўляць па-іспанску... Ён быў чалавекам энцыклапедычных ведаў, валодаў пяццю замежнымі мовамі. Меў фантастычную энергію і пачуццё гумару. Усе, з кім мы тады працавалі разам, і сёння ўспамінаюць яго. Мабыць, менавіта дзякуючы яму я зразумеў радасць, якую даюць свабодныя стасункі. А далей прыйшло пачуццё задаволенасці ад здольнасці разважаць.

## МАЯ ГАЛОЎНАЯ ВЯРШЫНЯ — САМАРЭАЛІЗАЦЫЯ

***— У вашым творчым багажы ёсць некалькі дакументальных фільмаў, кніга «26 гадзіна». Працягваць не плануеце?***

— Не, бо адсутнічае тэма, якой бы я зацікавіўся. Па тэме фінансаў, якую я закранаў у сваіх фільмах, я сказаў усё, і пакуль што нічога не змянілася. Калі будуць перамены, то пачну рэагаваць... Фінансавую тэматыку я планую падымаць і ў праграме «Контуры», бо ў Беларусі маецца недахопы ў гэтай сферы. І на іх варта звяртаць увагу.

***— Якую ж вяршыню будзеце заваёўваць цяпер?***

— Яна называецца «Самарэалізацыя». І я бачу, што ў Мінску я магу яе дасягнуць. Я маю патэнцыял, каб зрабіць найлепшую праграму. Здольны рэалізаваць сябе як радыёвядучы. Тут магу забяспечыць нармальнае жыццё свайму малодшаму сыну. Усё спрыяе таму, каб рухацца наперад. І, паверце, магчымасці, якія ёсць у Беларусі ў гэтым сэнсе, знойдзеш не ўсюды.

***— Дарэчы, у выхаванні двух сыноў вы строгі бацька ці строіце адносіны з імі з пазіцыі сябра?***

— У мяне ўжо тры сыны. У другім шлюбе нарадзіўся яшчэ адзін хлопчык, таму я шматдзетны тата. І калі гаварыць пра выхаванне дзяцей, то цяпер я імкнуся быць ім сябрам, хоць раней думаў, быццам з імі варта праяўляць строгасць. З часам прыйшоў да разумення таго, што куды важней мець цярпенне. І хлопцы ў мяне разумныя. Галоўнае, што мне ўдалося ім патлумачыць, — гэта тое, што ў жыцці можна прыняць любое рашэнне, але ў яго заўсёды ёсць свая цана. Мне здаецца, яны ўсё правільна зразумелі...

***— А вы цяпер адчуваеце сябе шчаслівым?***

— Абсалютна шчаслівым я сябе не адчуваю, бо жыццё ў прынцыпе запамінаецца ў выглядзе фотаздымкаў. Ні вы, ні хто-небудзь іншы не гатовы ўспомніць усю гісторыю цалкам. Успыхваюць толькі моманты. Мяне наведвае шчасце. І асалода ад яго — таксама толькі імгненне. Таму будзьце асцярожныя са шчасцем, і калі маеце, з кім ім дзяліцца, рабіце гэта абавязкова.

**Алена ДРАПКО.**
drapko@zviazda.by

## СЕРАДА, 15 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.35 Зона Х.
9.10, 22.00 **Серыял «След».**
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 **Серыял «Уратаванне кахання».**
12.10, 16.30 **Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
13.05 **Серыял «Дзявочае паляванне».**
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.40 **Дэтэктыў «Логава Змея».**
17.40 **Серыял «Давай пацалуемся».**
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 Актуальнае інтэрв'ю.
0.25 Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.45 **Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой».**
10.05 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
11.15, 21.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
12.15, 22.40 **Серыял «Косці».**
13.10 Беларуская кухня.
13.40 **Драма «Адпачынак у верасні». 1-я серыя.**



15.00, 19.10 **Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
17.55, 0.50 **Серыял «Гатэль «Вавілон».**
21.00 Мазгавы штурм.
21.35 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
23.35 **Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
0.00 **Серыял «Бівер Фолс».**

### БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 11.25, 18.50, 1.55 Калейдаскоп.
8.10 **«Трыццаць тры». Камедыя.**
9.25, 17.10 **«Бронзавая птушка». Прыгодніцкі фільм.**
10.30, 18.15 М/ф.
11.00, 1.30 «Свята далёкай зоркі». Памяці мастака Пятра Сергіевіча.
11.35 **«Ракавыя яйкі». Фантастыка.**
13.35 **«Настаўнік». Драма.**
15.15 **«Крыж на зямлі і поўня ў небе». Кінааповесць.**
16.40 «Наперад у мінулае».
19.00 **«Царэвіч Аляксей». Драма.**
20.45 Калыханка.
21.00, 23.20 «Вечар цяжкага дня» на «Славянскім базары».
21.25 **«Страсці па Уладзіміру». Камедыя.**
0.00 «Очарована, околдована...». Канцэрт заслужанага артыста Расіі Івана Бясєдзіна.

### БЕЛАРУСЬ 5

7.15, 7.45, 0.30 PRO спорт. Навіны.
7.30 Козел пра футбол.
8.00 Спорт-кадр.
8.30 Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Сан-Хасэ» — «Амерыка».
10.40, 22.25 Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
12.45 Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
14.50 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Чэбаксары. Дзень першы.
18.30 Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Сан-Хасэ» — «Амерыка».
20.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і кваліфікацыйны раўнд. 1-ы матч. «БАТЭ» (Барысаў) — «Дандолк» (Ірландыя).

### АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 **Серыял «Знайсці мужа ў вялікім горадзе».**
16.20 «Без сведак».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 **Серыял «Татавы дочкі».**
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 **Серыял «Практыка».**
23.00 **Маст. фільм «Аўстралія».**
1.50 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 **Меладрама «Рамэа і Джульета».**
10.40 **«Салдаты 7». Серыял.**
11.35 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.50 «Дакументальны праект»: «Секс-знакі».
14.45, 23.00 **«Фірменная гісторыя». Серыял.**
16.50 «Мінск і мінчане».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Нам і не снілася»: «Ілюзія розуму». 1-я частка.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 **Меладрама «Амаль замужам».**
21.55 «Глядзець усім!».
0.35 «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00, 5.25 «Зроблена ў СССР».
9.30, 2.20 **Маст. фільм «Свой хлопец».**
10.45 **Маст. фільм «Папялушка.ру».**



13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 1.30 **Серыял «Прыгажосць без ахвяр».**
14.15, 3.40 **Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
16.25, 0.35 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 **Серыял «Ты не адзін».**
19.25 **Маст. фільм «Клоўны».**
21.15, 23.15 **Серыял «Вясковая камедыя».**
0.25 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00, 17.10 «Мая планета».
7.35 **Маст. фільм «Падзенне ўверх».**
8.55 **Маст. фільм «Рыфмуецца з каханнем».**
10.50 «Біяхімія здрады».
12.10 **Маст. фільм «Навагодняя засада».**
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
18.00 **Серыял «Апошні янычар».**
20.55 «Асаблівы выпадак».
21.55, 23.10 **Серыял «Чужое гняздо».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 «Таямнічая Расія».
7.15 «Судовы дэтэктыў».
8.25 **Серыял «Вяртанне Мухтара».**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
10.25 **Серыял «Дарожны патруль».**
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.45 «Справа густу».
15.10, 16.25 **Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 **Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
21.20 **Серыял «Мянтоўскія войны».**
23.25 **Серыял «Пятніцкі. Глава другая».**
0.10 **Серыял «Горад спакус».**

### 8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.15, 21.05, 23.50 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.20, 19.20 **Серыял «Скандал».**
8.45, 18.15 **Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
9.25 «Кінаблакнот».
9.40, 13.50, 15.45, 16.30, 18.10, 19.00, 21.00 «Хатняя крама».
9.45 Дак. серыял «Скрозь прастору і час».
10.30 «Адшукваецца адпачынак.
11.00 **Камедыя «Усмешка бога».**
13.05 **Серыял «Страла».**
14.10 Дак. серыял «Уводзіны ў сабаказнаўства».
14.55 «Хатняя крама».
15.00 **Серыял «Рабыня Ізаўра».**
16.15 «Золата маўчання».
16.40 **Серыял «Мёртвая зона».**
20.50 «Вечарніца».
21.10 **Драма «Адданы садоўнік».**
23.20 **Серыял «Байкі са склепа».**

## Гараскоп на



**АВЕН.** Вы залішне спадзяецеся на свой розум, спрабуеце ўсе пытанні і праблемы, незалежна ад іх характару і паходжання, вырашыць пры дапамозе банальнага лагічнага мыслення, знайсці прычыны, вынік і выпрацаваць цікавую для вас стратэгію. Варта адзначыць належнае — у вас няблохна атрымліваецца пралічваць хады, але на гэтым тыдні лёс патрабуе ад вас зусім іншых дзеянняў. Халодны разлік можа толькі пагоршыць адносіны з навакольнымі, а то і зусім вас заблытаць. Вам неабходна навучыцца адпускаць падзеі ў самастойнае плаванне.



**ЦЯЛЕЦ.** Канец тыдня прадвесціць эмацыянальнае задавальненне і шчасце ў сямейным жыцці, а таксама, магчыма, і паляпшэнне фінансавага становішча. Але, каб гэтага дасягнуць, вам неабходна, перш за ўсё, разабрацца ў самім сабе, у сваіх таемных жаданнях, навучыцца разумець, узаемадзейнічаць і ўтаймоўваць свой унутраны свет. У гэты час добра займацца самапазнаннем і вывучэннем псіхалогіі, філасофіі. Свае эмоцыі неабходна трымаць пад кантролем, але не заганяць іх занадта далёка.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вам неабходна перастаць лунаць у аблоках і заняцца пытаннямі цалкам прыземленымі; справамі, звязанымі з нерухомасцю і іншымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі. Вас таксама чакае шэраг юрыдычных пытанняў, будзьце ўважлівыя да ўсіх здзелак, якія заключаюцца. На гэтым тыдні ўсё, што звязана з афармленнем дакументаў на нерухомасць і іншыя буйныя матэрыяльныя каштоўнасці, прынясе вам поспех і дазволіць адкрыць новыя перспектывы і пачаць асвойваць іншыя формы дзейнасці. Але строіць планы на будучыню трэба пасля, а не да заключэння кантрактаў і здзелак.



**РАК.** Фінансавае становішча дасягае стабільнасці, гэта той стан, калі вашы выдаткі роўныя вашым даходам. Такую раўнавагу лёгка парушыць, калі быць непамерным у патрэбах, але пры мудрым падыходзе ў ім можна знаходзіцца доўга і жыць у радасці. Другая палова тыдня вельмі спрыяльная для вас, асабліва ва ўсіх пытаннях, якія тычацца эмацыйнай сферы. Нельга назваць гэта прыступамі беспадстаўнай радасці; вашы эмоцыі, наадварот, увойдуць у стабільнае рэчышча, якое будзе мець пад сабой значную падставу.



**ЛЕЎ.** Вас чакаюць кіданні, будзе вельмі цяжка прыняць правільнае рашэнне, бо эмоцыі і запал будуць перапаўняць, і вы лёгка можаце стаць ахвярай памылак. Уяўны шырокі выбар перад вамі — не што іншае, як ілюзія, плод вашага ўяўлення і вынік няпоўнага разумення сітуацыі ці нежадання ўспрымаць рэальнасць адэкватна. У справах лепш дазволіць сабе адпачынак, вы і так ужо шмат чаго дамагліся, задавольвайцеся тым, што ёсць. Прыдатны час для актыўнай і імклівай дзейнасці — канец тыдня.



**ДЗЕВА.** Тыдзень важны для вас і вашага далейшага жыцця, хоць з першага погляду гэта можа быць і непрыкметна. Трэба будзе зрабіць сур'ёзны выбар, прычым, выбіраючы адно, неабходна будзе адмовіцца ад іншага, што не так проста. Гэта тычыцца як справ па працы, так і любоўнага трохвугольніка. Для правільнага выбару неабходна звярнуцца да сваёй падсвядомасці, пачуццяў. Вы здольныя інтуітыўна зразумець усё, што адбываецца, і парады іншых людзей вам не патрэбны. Правільны выбар прынясе вам гармонію і дабрабыт.

### ВТБ

6.00, 5.20 «PLAY».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 15.00, 3.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
8.00, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Васьмідзясятыя».
10.00, 19.00 Серыял «Апошні з Магікян».
11.00, 21.10 Серыял «Геймеры».
13.05, 23.10, 4.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
13.30, 1.00 Серыял «Дочкі-маці».
14.30, 3.00 «Летні фрэш».
15.30 Серыял «Ералаш».
16.00, 20.00 Серыял «Сваццi 2».
17.00, 5.00 «Лаві момант».
0.00, 4.00 «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

10.00, 15.00, 19.00, 23.00 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15, 0.20 «Прыстань на тым беразе». Маст. фільм.
12.25 «Пётр Першы». Дак. фільм.
12.30 «Правілы жыцця».
13.00 «Правінцыйныя музеі Расіі». Горад Гарадзец.
13.25 «Пецярбургскія інтэлігенты. Ганна Карцава». Дак. фільм.
13.55, 21.50 «Крах інжынера Гарына». Маст. фільм.
15.10 «Гістарычныя падарожжы Івана Талстога». Дак. серыял.
15.35, 1.55 «Палігloт». Вывучым англійскую за 16 гадзін!
16.20, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
16.35 «Больш, чым каханне». Марк Бернес.
17.15 «4001-ы літарны». Дак. фільм. 1-я серыя.
17.45 VI вялікі фестываль РНА. Дж. Вердзі. Уверцюры і балетная музыка з опер.
18.30, 1.25 «Атланты. У пошуках ісціны». «Гісторыя з геаграфіяй, або Як уплывае клімат на гістарычныя падзеі?»
19.15 Жыццё цудоўных ідэй. «Інсулінавыя войны».
19.45 «Добрай ночы, малыя!»
19.55 «Каця і прынц». Дак. фільм.
20.40 Штучны адбор.
21.20 «Маналог у 4-х частках».
23.15 Мастсавет.
23.20 Лаўрэаты прэміі ТЭФІ-2015. «Наглядальнік». Лепшае.

### НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок». 2004 год.
7.10 Маст. фільм «Два Фёдары».
8.45, 14.45 М/ф «Прыгоды Рэкса».
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час».
9.40, 11.00, 11.35, 12.25, 14.25, 15.40, 17.00, 17.35, 18.25, 20.25, 21.40, 23.00, 23.35, 0.40, 2.30, 3.15, 5.20 Музычная настальгія.
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
11.30, 17.30 «Прэс-экспрэс». 1995 год.
12.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Алег Басілашвілі. «Навошта вам гэта сумненная прафесія?».
13.00 Маст. фільм «Выпадак са следчай практыкі».
18.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Ад Аркадзя Райкіна да...
19.00 Маст. фільм «Пароль веdалі двое».
20.35 М/ф «Прыгоды перца».
23.30 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Леанід Уцёсаў. 1-я частка.
0.00 «Акулы пяра». Ілья Кармільцаў. 1997 год.
1.30 «Аліса». Фільм-канцэрт групы «Аліса». 1988 год.
3.00 М/с «Болек і Лёлек на канікулах».
4.00 Маст. фільм «За твой лёс».

### EUROSPORT

3.30 WATTS.
4.00, 11.45, 18.45, 0.00 Лёгкая атлетыка. Спаборніцтвы ЕАА.
5.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-19).
7.00, 9.30, 14.00, 18.00, 23.00, 2.30 Веласпорт.
8.00, 10.30, 1.00 Фехтаванне. Чэмпіянат свету.
11.30 Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
13.00 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
13.30 Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
15.15 Веласпорт. Нацыянальны тур дэ Франс.
19.45, 22.55 Выбранае па серадах.
19.50 Конны спорт.
20.50 Конны спорт. Кубак нацый.
21.10 Гольф. Тур PGA.
22.10 Гольф. Еўрапейскі тур.
22.40 Лепшае за месяц.
22.45 Гольф-клуб.
22.50 Парусны спорт. Яхт-клуб.

### КАМЕДЫЯ

**6.00 — Прафілактыка на тэлеканале.**
12.00, 17.40, 22.00, 3.10 Серыял «Пакетная здзелка».
12.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
14.00, 14.45, 15.25 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 20.00, 21.45, 0.50, 2.55, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Меладрама «Удачы, Чак».
18.25 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
20.20 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
23.10 Меладрама «Даю год».
1.15 Камедыя «Дзікая штучка».
4.00 Камедыя «Мамусі».

### ТБ3

6.00 М/ф.
7.55, 3.30 «Дачныя гісторыі».
8.20, 19.05, 1.40 Серыял «Забароненае каханне».
9.45, 3.55 Дак. серыял «Судовыя страсці».
10.35, 4.40 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
11.30, 17.05 «Дак. серыял Справа Астахава».
12.20, 16.10 Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
13.15, 18.05 Серыял «Тайны следства».
14.15, 3.05 «Простыя складанасці».
14.45, 22.30 «Зорныя гісторыі».
15.40, 5.30 «Нераскрытыя тайны».
20.45, 0.10 Серыял «Сямейны дэтэктыў».
23.25 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

6.00 Камедыя «Мільён для чайнікаў».
8.00 Драма «Прыгавор».
10.00 Камедыя «Два дні ў Нью-Ёрку».
11.45 Фантастыка «Місія «Серэніці».
13.55 Трылер «Прэстыж».
16.10 Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
18.10 Меладрама «Слова».
20.00 Драма «Прынцэса Манака».
22.05 Драма «7 дзён і начэй з Мэрылін».
23.45 Камедыя «Starперцы».
1.30 Камедыя «Радасная падзея».
3.20 Трылер «Адзінокая белая жанчына».
5.20 Драма «Заганныя сувязі».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Год цяляці».
7.45 Меладрама «Выключэнне з правілаў».
9.20 Драма «Іуда».
11.10 Трагікамедыя «Мастацтва жыць у Адэсе».
12.55 Драма «Барані мяне, мой талісман».
14.10 Дзіцячы фільм «Прыватнае піянерскае».
15.55 Драма «Брэсцкая крэпасць».
18.15 Драма «Неба паўшых».
20.20 Дэтэктыў «Дачка».
22.15 Драма «Старэйшая жонка».
23.50 Камедыя «Кур'ер з «Раю».
1.30 Камедыя «Пісталет Страдывары».
2.55 Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».
4.25 Камедыя «Двайная згуба».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 7.40, 12.40, 16.50 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
6.50, 9.20, 13.30, 14.20, 19.20 Гульні розуму.
7.15 Папулярная навука.
8.30 Ракавая стыхія.
10.10, 15.10, 20.10 Шырокі погляд.
11.00 Мегазаводы.
11.50 Скарбашукальнікі.
13.55 Навуковыя недарэчнасці.
16.00, 22.40, 2.00, 5.15 Місія. Плутон.
17.40 Экстрэмальны экспрэс.
18.30 Дзікі тунец.
21.00 Космас: прамы эфір.
21.50, 1.10, 4.30 Касмічнае падарожжа «Хабла».
23.30, 3.40 Расследаванні авіякатастроф.
0.20 Паранармальнае.
2.50 Уварванне на Зямлю.

### DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 А ты б выжыў?
9.40, 13.50 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
12.10, 18.00 Скарбашукальнікі Амерыкі.
13.00, 0.40, 6.25 Мужчынскія бярлогі.
14.40, 5.35 Не спрабуйце паўтарыць.
16.20, 4.00 Пятая перадача.
17.10, 4.50 Махінатары вярталюцца.
18.50 Дом для аўто.
19.40 Поўны фарсаж.
20.30 У пагоні за класікай.
22.10 Паляўнічыя на склады.
23.00 Што ў вас у гаражы?
23.50 Гаражнае золата.
1.30, 7.10 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.
3.10 Склады.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Удача можа ўсміхнуцца вам у фінансавых справах. З упэўненасцю заключайце здзелкі, пачынайце новыя кампаніі. Час спрыяльны менавіта для ўнясення навін у ваша матэрыяльнае жыццё, не варта чакаць ад падзей імгненнага поспеху, бо на ўсё патрабуецца час. У эмацыйнай сферы, наадварот, назіраецца спад — такі закон раўнавагі. Вы можаце адчуць сябе адзінокімі і кінутымі, хоць больш правільна будзе сказаць, што вы самі адышлі ад людзей. Але і з гэтага стану можна атрымаць карысць для сябе.

**СКАРПІЁН.** Чарговая хваля тыраніі захлісне вас, вы адчуеце ўладу ў сваіх руках і пачнеце выкарыстоўваць яе. Сваю праяву яна знойдзе ў новых пачынаннях, у актыўных дзеяннях, накіраваных на паляпшэнне вашай будучыні, свайго асабістага развіцця. Адзінае, што можа пашкодзіць, дык гэта некаторая няпэўнасць, адсутнасць выразнага разумення, на які менавіта шляху неабходна рухацца, у які бок прыкладаць намаганні. Не распыляйцеся, паспрабуйце сканцэнтравацца на чымсьці адным, і тады вас чакае поспех.

**СТРАЛЕЦ.** Усё ў вашых руках — хоць вы і самі гэта ведаеце, такая фраза даўно стала дэвізам у вашым жыцці. Гэты тыдзень толькі чарговае пацверджанне таму. У першай яго палове вы можаце стаць ахвярай падману, калі будзеце няўважлівыя. А калі будзеце залішне пільныя, то зможаце і самі пракруціць не зусім сумленную, але выгадную для вас справу. Але што б ні адбылося ў гэты момант, канец тыдня ў любым выпадку спрыяльны. Вас чакае хатняя ўтульнасць і стабілізацыя ва ўсіх сферах, асабліва ў справах, звязаных з працай.

**КАЗЯРОГ.** Час узбадзёрыцца, ачнуцца для новага жыцця, бо нельга так доўга заседжвацца на адным месцы, добрае яно ці дрэннае. Жыццё прымушае ўсё змяняцца і мяняе нас саміх, таму мы знаходзімся ў пастаянным руху. Такі перыяд надыходзіць для вас на гэтым тыдні, але, вядома, такім кароткім прамежкам часу ён не скончыцца. У вашым жыцці будуць змены. Вам трэба будзе схамянуцца і паставіць перад сабой задачу, дасягнуўшы якую, вы набудзеце спакой і дабрабыт.

**ВАДАЛЕЙ.** Падзеі, якія бударажылі вашу душу, засталіся ў мінулым. Надыходзіць перыяд спакойнага сузірання, калі вашы эмоцыі знаходзяцца ў раўнаважкім стане, няма радасці і гора, няма і патрэбы ў тым, каб нешта мяняць. Перыяд спакою добры для разважанняў, спрыяе больш яскраваму рашэнню рабочых пытанняў. У справах трэба будзе аб'яднацца, каб больш актыўна і ўпэўнена рухацца наперад. Перад вамі адкрываюцца новыя гарызонты, новыя магчымасці. Пачынанні запатрабуюць дадатковых сіл.

**РЫБЫ.** Заставайцеся ў спакоі, няма нічога, што б магло вывесці вас з раўнавагі. Зараз надыходзіць той перыяд, у які вы можаце памяняць сваю эмацыйнасць на ўраўнаважанасць і стабільнасць. А калі дасягнеце гэтага стану для сябе, то зможаце дапамагчы парадай іншым людзям. Спакой і дабрабыт вельмі важныя для нас, хоць і іх таксама павінна быць у меру. Скарыстайцеся гэтым момантам для адпачынку і аднаўлення сіл, не трэба адцягвацца на не вартыя ўвагі дробязі.

## ЧАЦВЕР, 16 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Ураўненне кахання».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.40 Дэтэктыў «Логава Змея».**
**17.40 Серыял «Давай пацалуемся».**
**19.20, 23.50** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Спецыяльны рэпартаж.
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой».**
**10.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**11.15, 21.40** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.15, 22.40 Серыял «Косці».**
**13.05** Беларуская кухня.
**13.40 Драма «Адпачынак у верасні». 2-я серыя.**
**15.00, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.55, 0.50 Серыял «Гатэль «Вавілон».**
**21.00** Мазгавы штурм.
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.35 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.05 Серыял «Бівер Фолс».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.35, 18.40, 1.10** Калейдаскоп.
**8.10 «Царэвіч Аляксей». Драма.**
**9.55** «Маскоўскі Крэмль». Дак. фільм.
**10.55, 16.55 «Бронзавая птушка». Прыгодніцкі фільм, заключная серыя.**
**12.00 «Дачка марака». Меладрама.**
**13.10, 0.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака БССР Яўгена Красоўскага.
**13.45 «Страсці па Уладзіміру». Камедыя.**
**15.40** «Сустрэчы ў «Букваедзе». Аляксандр Васільеў і Алена Рэзнік.
**17.55** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Бронзавая птушка».
**18.20** М/ф.
**18.50** «Сіла веры».
**19.20 «Радзіма ці смерць». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.00, 22.45** «Вечар цяжкага дня» на «Славянскім базары».
**21.25 «Брунетка за 30 капеек». Камедыя.**
**23.25** «Я люблю тебя, жизнь!». Творчы вечар акцёра тэатра і кіно, спевака і кампазітара Анатоля Дluskaга.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.15, 7.45, 0.25** PRO спорт. Навіны.
**7.30, 18.35** Сэлфі.
**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-і кваліфікацыйны раўнд. 1-ы матч. «БАТЭ» (Барысаў) — «Дандолк» (Ірландыя).
**9.50** Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
**11.55** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Чэбаксары. Дзень другі.
**13.55** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
**15.55, 17.25, 18.55, 22.00** Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Чвэрцьфінал.
**17.10** Козел пра футбол.
**20.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 2-і кваліфікацыйны раўнд. 1-ы матч. «Чорна Мора» (Балгарыя) — «Дынама» (Мінск).

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10 Серыял «Легкадумная жанчына».**
**16.20** «Без сведак».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Практыка».**
**23.25 Дэтэктыў «У тыле ворага».**



**1.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Меладрама «Амаль замужам».**
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40 «Салдаты 7». Серыял.**
**11.40** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Дакументальны праект»: «Сваякі».
**14.45, 23.20 «Фірменная гісторыя». Серыял.**
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Нам і не снілася»: «Ілюзія розуму».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Рамза павінен памерці».**
**22.15** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».
**0.55** «Тайны свету».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Чаму я?».
**9.30, 2.25 Маст. фільм «Адзін у адзін».**
**11.20 Маст. фільм «Клоўны».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 1.30 Серыял «Прыгажосць без ахвяр».**
**14.15, 4.15 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Ты не адзін».**
**19.25 Маст. фільм «Развітанне славянкі».**
**21.10, 23.15 Серыял «Вяскова камедыя».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 17.10** «Уся Расія».
**12.15 Маст. фільм «Цыган».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**20.55** «Асаблівы выпадак».
**21.55, 23.10 Серыял «Чужое гняздо».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Сонечна. Без ападкаў».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.45** «Справа густу».
**15.10, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
**21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.25 Серыял «Пятніцкі. Глава другая».**
**0.10 Серыял «Горад спакус».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.10, 19.15, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 19.20 Серыял «Скандал».**
**8.45, 18.15 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45** Дак. серыял «Скрозь прастору і час».
**10.30** «Хобі TV».
**11.00 Трылер «Сайлент хіл».**



**13.00, 13.55, 15.45, 16.30, 18.10, 21.00** «Хатняя крама».
**13.10 Серыял «Страла».**
**14.15** Дак. серыял «Уводзіны ў сабаказнаўства».
**15.00 Серыял «Рабыня Ізаўра».**
**16.40 Серыял «Мёртвая зона».**
**19.00** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Паляванне».**
**23.20 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 15.00, 2.30, 3.30** Скетчшоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00, 19.00** Серыял «Апошні з Магікян».
**11.00, 21.10** Серыял «Геймеры».
**13.05, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**13.30, 1.00** Серыял «Дочкі-маці».
**14.30, 3.00** «Летні фрэш».
**15.30** Серыял «Ералаш».
**16.00, 20.00** Серыял «Сваці 2».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15, 0.15** «Афрыканыч». Маст. фільм.
**12.30** «Правілы жыцця».
**13.00** «Пісьмы з правінцыі». Кастрама.
**13.25** «Пецярбургскія інтэлігенты. Дзмітрый Івашынцаў». Дак. фільм.
**13.55, 21.50** «Крах інжынера Гарына». Маст. фільм.
**15.10** «Гістарычныя падарожжы Івана Талстога». Дак. серыял.
**15.35, 1.55** «Паліглот». Вывучым англійскую за 16 гадзін!
**16.20, 2.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.35** «Астравы». Мая Булгакава.
**17.15** «4001-ы літарны». Дак. фільм.
**17.45** VI вялікі фестываль РНА. Дж. Вердзі. Сцэны і арыі з опер.
**18.30, 1.25** «Атланты. У пошуках ісціны». «Тайны атмасфернай электрычнасці — ці можа чалавек прыручыць маланку?».
**19.15** Жыццё цудоўных ідэй. «Алмазная ліхаманка».
**19.45** «Добрай ночы, малыя!».
**19.55** «Бенкендорф. Пра беднага жандара закіньце слова...». Дак. фільм.
**20.40** Штучны адбор.
**21.20** «Маналог у 4-х частках».
**23.15** Мастсавет.
**23.20** Лаўрэаты прэміі ТЭФІ-2015. «Наглядальнік». Лепшае.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Алег Басілашвілі. «Навошта вам гэта сумніўная прафесія?».
**6.25, 8.25, 9.40, 11.00, 11.35, 12.25, 15.40, 17.00, 18.05, 20.45, 21.40, 23.00, 3.40, 5.00, 5.35** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Выпадак са следчай практыкі».
**8.45, 2.45** М/ф «Прыгоды Рэкса».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30, 18.00, 5.30** «Прэс-экспрэс».1995 год.
**12.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Ад Аркадзя Райкіна да...
**13.00** Маст. фільм «Пароль ведалі двое».
**14.35** М/ф «Прыгоды перца».
**17.30, 23.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Леанід Уцёсаў.
**19.00** Маст. фільм «Алеся».
**20.20** М/ф «Прыгоды малыша Гіпапо».
**0.00** «СевАлгія» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок». 2004 год.
**1.10** Маст. фільм «Два Фёдары».

### EUROSPORT

**3.30** Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.
**5.30, 10.00** Лёгкая атлетыка. Спаборніцтва ЕАА.
**7.00, 11.00, 14.00, 18.15, 23.45, 2.30** Веласпорт.
**8.00, 0.45** Фехтаванне. Чэмпіянат свету.
**9.30** Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
**12.15** Веласпорт. Нацыянальны тур дэ Франс.
**18.30, 21.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-19).

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.40, 22.00, 3.10** Серыял «Пакетная здзелка».
**6.45** Камедыя «Свята пад замком».
**8.05, 14.25, 15.10, 19.45, 22.50, 0.55, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**8.25** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**10.45** Меладрама «Удачы, Чак».
**12.25** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Даю год».
**18.20** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**20.20** Меладрама «Красуні».
**22.25** Серыял «Былыя». 1-я серыя.
**23.10** Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
**1.15** Камедыя «І не чырванее».
**4.00** Камедыя «Дзікая штучка».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Дачныя гісторыі».
**8.25, 19.10, 2.05** Серыял «Забароненае каханне».
**9.50, 3.50** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.40, 4.40** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.35, 17.10** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 16.15** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.20, 18.10** Серыял «Тайны следства».
**14.15, 3.25** «Простыя складанасці».
**14.45, 22.35** «Зорныя госці».
**15.45, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**20.50, 0.35** Серыял «Сямейны дэтэктыў».
**23.35** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**0.25** «Рокіно».

### ТБ1000

**6.50** Драма «Усё самае лепшае».
**8.35, 16.25** Трылер «Адзінокая белая жанчына».
**10.35, 0.55** Трылер «Сетка».
**12.40** Трагікамедыя «Два дні ў Парыжы».
**14.35** Камедыя «Два дні ў Нью-Ёрку».
**18.20** Камедыя «Справа ў табе».



**20.00** Камедыя «1+1».
**21.55** Драма «10 крокаў да поспеху».
**23.20** Трылер «Добры доктар».
**2.55** Драма «Брудныя гульні».
**4.55** Камедыя «Атэль рамантычных спатканняў».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Баявік «Сіндром шахматыста».
**10.20** Камедыя «Аднакласнікі. ru: НаCLICKай поспех».
**12.20** Драма «Ваенна-палявы раман».
**14.05** Драма «Дуброўскі».
**16.25** Камедыя «Звычка расставацца».
**17.50** Драма «Гамлет XXI стагоддзе».
**20.20** Баявік «22 хвіліны».
**21.45** Баявік «Антыкілер».
**23.40** Драма «Мужчынскі сезон: Аксамітная рэвалюцыя».
**1.40** Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**3.10** Меладрама «Клоўны».
**5.00** Дзіцячы фільм «Краіна добрых дзетачак».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 12.40, 16.50** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 7.40, 13.30** Гульні розуму.
**7.15** Папулярная навука.
**8.30** Шырокі погляд.
**9.20, 14.20, 19.20** Місія. Плутон.
**10.10, 15.10, 20.10** Касмічнае падарожжа «Хабла».
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Скарбашукальнікі.
**13.55, 23.05** Навуковыя недарэчнасці.
**16.00** Апошні тыгр Суматры.
**17.40, 21.00, 1.10, 4.30** Дзікая будоўля.
**18.30, 21.50, 2.00, 5.15** Незвычайныя здабычы.
**22.40** Код небяспекі.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Паранармальнае.
**2.50** Уварванне на Зямлю.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.40, 13.50** Пятая перадача.
**12.10, 18.00** Склады.
**13.00, 6.25** Гульня на жыццё.
**14.40, 5.35** Забойныя дылемы.
**16.20, 4.00** Аўтамабільны гандаль у Тэхасе.
**17.10, 4.50** Махінатары вартаўніцтва.
**18.50** Гаражнае золата.
**19.40** Што ў вас у гаражы?
**20.30** Паляўнічыя на склады.
**22.10** Ледзяное золата.
**23.00** Войны за малюскаў.
**23.50** Дарожныя каўбоі.
**0.40, 3.10** Бітва за нерухомасць.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

# АКЦЁРЫ, вядомых сабак кінематографа



З астатнімі сцэнамі бліскуча справіўся Сціў-Сцёпа, якога гаспадар здаў у арэнду кінастудыі і... знік на паўтара года, з-за чаго сабака невыносна сумаваў. Каб крыху падбадзёрыць яго і не сарваць здымкі, акцёры песцілі сабаку, як маглі.

## «Прыгоды Электроніка»

Хто з савецкіх дзяцей у свой час не марыў мець такога сабаку, як Рэсі?.. У пазакадравым жыцці гэтага сімпатычнага эрдэля звалі Чынгіз, і ён не раз здзіўляў здымачную групу сваім жыццярадасным характарам. Так, аднойчы рэжысёр Канстанцін



Бромберг сварыўся з апаратарам, якім аб'ектывам лепш здымаць сцэну. Спрэчку перапыніў Чынгіз — ён прынёс у зубах аб'ектыў, які задаволіў абодвух.

Другі раз па сцэнарыі Рэсі адкусвае дула ў бандыцкага пісталета. У дзіцячай краме загадзя набылі два пісталеты, адзін крыху падпілавалі, каб падмяніць зброю пасля скачка сабакі. Але ў працэсе рэпетыцый Чынгіз, якога дражнілі курыцай, так «настроіўся», што сапраўды адкусіў дула! Мікалай Карачанцаў, які іграў Уры, быў у такім шоку, што свой тэкст: «Ты навошта зжэр зброю?!» — прамовіў чыста машынальна, але затое дубль атрымаўся выдатным.

## «Трое ў лодцы, калі не лічыць сабаку»

«Манмарансі, выведзі нас адсюль!» — на гэту пранікнёную просьбу герояў знакамітай савецкай камедыі насамрэч адгукаўся не адзін, а два чатырохлапыя акцёры. Фокстэр'ер Герцаг паслухмяна



і цярпліва выконваў розныя трукі, а яго напарнік па мянушцы Грэх здымаўся толькі разам з людзьмі і, апраўдваючы сваё імя, перыядычна смяшыў акцёраў, ледзь не зрываючы здымкі.

**Ліна МАЛІНІНА**

## СУБОТА, 18 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

5.30 Існасць.
**5.55 Меладрама «Муж на час».**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Буйным планам.
**9.40, 23.20 Серыял «Кухня». Заключныя серыі.**
10.45 «50 рэцэптаў першага».
11.25 Дача.
12.10 «Здароўе». Ток-шоу.
12.50 Кулінарная дыпламатыя.
13.25 Выхад ёсць.
**14.00, 0.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Нашы.
**15.45 Лірычная камедыя «Хачу замуж».**
17.30 «Нам не жыць адзін без аднаго». Творчы вечар кампазітара Аляксандры Пахмутавай і паэта Мікалая Дабранравава.
**19.15, 21.35 Меладрама «Васількі». 1—2-я серыі.**
21.00 Панарама.
0.20 Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

6.50 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**7.40 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
9.40 Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
10.10, 21.30 Тэлебарометр.
10.15 Азбука смаку.
10.50 Анімацыйны фільм «Оз: Вяртанне ў ізумрудны горад».
12.20 Капейка ў капейку.
12.55 «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**14.40, 23.35 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**17.05 Баявік «Былых не бывае». 1—4-я серыі.**
21.00 Мазгавы штурм.
21.35 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40 Камедыя «Сябар нявесты».**
23.30 Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 13.30, 17.35, 23.30 Калейдаскоп.
8.10 «АРТіШОК». Бітлз-фестываль на Беларусі.
**8.35, 15.55 «Дзень добры, я ваша цётка!» Камедыя.**



10.15 «Камертон». Спявак, кампазітар, народны артыст Расіі Аляксандр Градскі.
10.40 «Вандроўніца». Старонкі кніг Сафіі Снесаравай пра вандроўніцу Дар'юшку. Дак. фільм.
**11.25 «Іжорскі батальён». Драма.**
12.50 «Якаў Крэйзер. Забыты генерал». Дак. фільм.
13.40 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
14.15 М/ф.
14.30 «Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты». Рок-опера.
**17.45 «Чалавек-амфібія». Фантастыка. 1-я — 4-я серыі.**
20.45 Калыханка.
**21.00 «Сабрына». Меладрама.**
22.50 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Алесь Камоцкі.

### БЕЛАРУСЬ 5

6.30, 7.00, 1.35 PRO спорт. Навіны.
6.45 Спорт-мікс.
7.20 Піт-стоп.
7.45 Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
9.50 Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Амерыка» — «Манчэстар Юнайтэд».
11.55, 22.50 Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Рэал Мадрыд» — «Рома».
13.55, 15.55 Тэніс. Уімблдон. Адзіночны разрад. Жанчыны. Фінал.
17.55 Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Румынія — Беларусь.
20.25, 21.35 Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Паўфінал.
0.40 Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.25 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
**12.20 Серыял «Асабістае жыццё следчага Савельева».**
16.15, 21.00 Навіны спорту.
**16.20 Камедыя «Інструкцыі не прыкладаюцца».**
18.45 «ДОстояние РЕспублики: Аляксей Рыбнікаў».
21.05 «Сёння вечарам».
22.35 «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**0.05 Камедыя «Дзве стралы. Дэтэктыў каменнага веку».**

### СТБ

**6.15 Камедыя «Паміж анёлам і чортам».**
8.05 «Тайны свету».
9.00 «Сакрэтныя тэрыторыі».
**9.55 Маст. фільм «Майская ноч, або Тапельніца».**
11.00 «Мінск і мінчане».
**11.40 «Салдаты 3». Серыял.**
13.30, 16.30, 19.30 «24 гадзіны».
13.40, 1.50 Дэтэктыў «Інспектар ДАІ».
15.10 «Вадзіць па-руску».
15.50 «Вялікі горад».
16.40 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.50 Камедыя «Час пік 3».**
20.00 «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Нябачны бок».**
22.25 «Дакументальны спецпраект»: «Пісьмы з космасу», «Браты па космасе».
0.10 «Масква. Дзень і ноч».

### МІР

6.00, 8.45, 12.15, 4.50 М/ф.
**6.50 Маст. фільм «Варатар».**
8.20 «Саюзнікі».
9.05 «Эксперыментатары».
9.30 «Ой, мамачкі!».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «За двума зайцамі».**
**13.00 Маст. фільм «Рымскія канікулы».**
15.15 «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Жаночыя мары пра далёкія краіны».**



**21.50 Маст. фільм «Залегчы на дно ў Бругге».**
**23.55 Маст. фільм «Догвіль».**
**3.20 Маст. фільм «Антон Івановіч сярдуе».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «ХА». Маленькія камедыі.
**7.40 Маст. фільм «Час качаць».**
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Утаймавальнікі гуку».
**12.15 Маст. фільм «Бацькоўскі дом».**
14.30 «Пакой смеху».
16.15 «Вызваліцелі». «Танкісты».
17.10 «Суботні вечар».
19.00 «Вуліца Вясёлая».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
**20.35 Маст. фільм «Водпуск летам».**
**22.30 Маст. фільм «Уцякаць нельга загінуць».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.10, 8.20 Серыял «Пляж».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
8.50 «Урачэбныя тайны плюс».
9.25 «Справа густу».
10.25 «Галоўная дарога».
10.55 «Паедзем, паядзім!».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Тайны кахання».
**14.20, 16.20 Серыял «Псеўданім «Албанец».**
18.05 «Следства вялі».
19.25 «Летняе цэнтральнае тэлебачанне».
20.00 «Самыя гучныя рускія сенсацыі».
21.50 «Ты не паверыш!»
**22.30 Баявік «Толькі наперад».**
0.15 «ГРУ: Тайны ваеннай разведкі».

### 8 КАНАЛ

9.00, 14.05, 19.05, 21.00, 23.15 «Надвор'е».
9.05 М/ф.
10.25, 11.30, 15.55, 17.20 «Хатняя крама».
**10.40 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
11.20 «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.45 Драма «Падмена».**
**14.10 Камедыя «Незвычайныя прыгоды італьянцаў у Расіі».**
16.00 Адшукваецца адпачынак.
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.30 Серыял «Шэрлак».**
**19.10 Камедыя «Вайна нявест».**
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Фантастыка «Рыдзік».**
23.20 «Хобі TV».

### ВТБ

6.00 «PLAY».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 17.00 Серыял «Ералаш».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 2.00 «Турбаміксер».
12.00 Драма «Танцы на вуліцы: Нью-Ёрк».
14.10, 23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.30 «Хатняя кухня».
15.00, 5.00 Серыял «Паласатае шчасце».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
20.30 Камедыя «Даспехі Бога 3: Місія Задыяк».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 Скетчком «Студэнты».
0.30, 4.30 «Лаві момант».
1.00 «Ленінградскі Stand-up клуб».

### КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Госць з Кубані». Маст. фільм.
11.45 «Анатоль Кузнецоў». Дак. фільм.
12.25 «Севастопальскія апавяданні. Падарожжа ў гісторыю з Ігарам Златавіцкім». Дак. серыял.
13.10 Спектаклі-легенды. Мікалай Карачанцаў, Алена Шаніна, Аляксандр Абдулаў у пастаноўцы Марка Захарава «Юнона» і «Авось».
14.35, 0.40 «Музычная кулінарыя. В.А. Моцарт і Л. Да Понтэ».
15.25 «Гульня ў бісер». «Л.М. Талстой. «Ганна Карэніна».
16.05 «Ганна Карэніна». Маст. фільм.
18.40 «Больш, чым каханне». Валерый Чкалаў і Вольга Эрэхава.
Генетычныя прыкметы дзіцяці па 15 тэстах параўноўваюцца з ДНК-характарыстыкамі патэнцыйнага бацькі. Усюды супадзенне — значыць, мужчына сапраўды тата. У трох працэнтах выпадкаў супрацоўнікі камітэта сутыкаюцца з мутацыямі. Каб упэўніцца ў тым, што разыходжанне ў адным з 15 тэстаў — справа прыроды, а не ўдзел блізкага сваяка верагоднага таты, праводзяць паглыбленае даследаванне. Калі ў трох і болей тэстах няма супадзенняў, бацькоўства выключаецца. Такія несуцяшальныя вынікі (хоць для тых, хто не збіраўся плаціць аліменты і прызнаваць сына ці дачку, гэты варыянт пажаданы) чакаюць пятую частку мужчын (каля 400 чалавек за год), што прыйшлі на экспертызу.

Абавязковая ўмова для правядзення даследавання — адначасовая яўка ў лабараторыю дзіцяці, маці і патэнцыйнага таты.

— Бывае, бабулі тэлефануюць: маўляў, нявестка ненадзейная, падманула майго сына, я да вас зараз прыеду з матэрыяламі. Вядома, мы такія звароты не разглядаем. Пара павінна сама вырашыць, ці патрэбна ёй гэтае даследаванне, і свядома прыйсці, — кажа Мікалай Кузуб.

Зрабіць тэст уціхую ад маці дзіцяці? Можна. Праз прыватныя кампаніі. Праўда, Мікалай Мікалаевіч папярэджвае, што за якасць працы такіх экспертаў ручацца не будзе: ніхто з іх не атрымліваў ліцэнзію ў Дзяржкамітэце.

### САБРАЦЬ СЯМ'Ю

Перыпетыі прыватнага жыцця, што адкрываюцца падчас экспертызы, — гатовы сюжэт меладрамы, над якой будзе плакаць і ўздыхаць не адна хатняя гаспадыня. «На маёй памяці было да пяці спроб знайсці бацьку, — расказвае Мікалай Мікалаевіч (ён займаецца генетычнымі даследаваннямі больш за 20 гадоў). — Максімальная колькасць дзяцей, што ўдзельнічалі ў экспертызе, — сем. Аднойчы тата прыязджаў да нас паслядоўна з трыма «камплектамі» малых. Прычым з усімі жанчынамі ён быў у добрых адносінах».

Некаторыя сітуацыі наогул здаюцца неверагоднымі. Пару разоў да генетыкаў звярталіся з просьбай вызначыць бацьку з братоў-блізнят! Праўда, тымі метадамі, якімі валодаюць навукоўцы, адрозніць на генетычным узроўні аднаяйцавых двайнят немагчыма. У тэорыі, калі цалкам разабраць геном чалавека, шанц ёсць. Але на практыцы такога даследавання не робяць. Падобны тэст будзе настолькі дарагім, што значна танней выплачваць аліменты да канца жыцця.

Бываюць і шчаслівыя выпадкі, калі заключэнне генетыкаў дапамагае аб'яднаць сям'ю. Мой суразмоўца згадвае гісторыю дзесяцігадовай даўнасці пра жанчыну, якая паехала на заробкі ў Германію, пазнаёмілася там з мужчынам і зацяжарала ад яго. На чужыне маладая маці не засталася: вярнулася ў Беларусь. Але праз колькі часу памерла ад анкалогіі, а малы трапіў у інтэрнат. Калі хлопчыку з нязвыклым для беларусаў імем Эрык было сем гадоў, яго заўважыла перакладчыца, якая разам з нямецкімі прадстаўнікамі развозіла гуманітарную дапамогу па дзіцячых дамах. Пачала распытваць школьніка, звярталася ў СМІ. І нарэшце знайшла тату. Экспертыза бацькоўства пацвердзіла, і ў хлопчыка з'явілася сям'я.

Цяпер, дарэчы, папулярна шукаць родзічаў праз тэсты ДНК. Так званая генетычная генеалогія. На Захадзе гэты рух набыў шырокія маштабы. Нягледзячы на тое, што пра 5-6 папярэдніх пакаленняў можна даведацца ў архіве, некаторыя хочуць атрымаць пацвярджэнне з боку навукі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ГОРКІ ПАХ ЯЗМІНУ



## Кідаючы пад ногі тое, што маеш, можаш апынуцца на краі бездані

КАЗАК у жыцці ў прынцыпе не бывае, а тыя, што ўсё ж зрэдку здараюцца, песціш у памяці доўгія гады, стараючыся захаваць кожную драбніцу, каб зноў і зноў вяртацца да таго адчування акрыленай радасці.

У мяне да нядаўняга часу была такая казка — простая і прыгожая. Яна здарылася дзевяць гадоў назад і пачыналася ў тлуме і беганіне — з «гарачай пуцёўкі», якую купілі ў самы апошні момант за проста смешныя грошы. Потым былі бакавыя месцы ў плацкарце маскоўскага цягніка, мітуслівая дарога да Внукава, самалёт, на які паспелі толькі цудам, сумка, якая ў аэрапорце далёкай незнаёмай краіны ўмудрылася зваліцца ў сярэдзіну круга, па якім рухаліся рэчы прылящеўшых пасажыраў, пошук таго, хто яе дастане, а пасля — патрэбнага аўтобуса сярод сотні іншых, што стаялі на пляцоўцы. Цёмная-цёмная ноч, якая раптоўна, без прыцемкаў, апусцілася проста на галаву чорнай безданню неба з калючымі яркімі зоркамі і не дала разгледзецца, зразумець, асэнсаваць...

Але потым настала раніца, і, выглянуўшы ў акно свайго пакоя, мы проста ахнулі. Блакітнае спакойнае мора, крыху святлейшае за яго неба, белы пясок на пляжы, пальмы, з якіх цяжкімі гронкамі звісаюць фінікі, вялізныя, дагэтуль нябачаныя кветкі ўсіх магчымых адценняў... Горад, у які мы трапілі, сапраўдны ўсходні горад, жыў сваім размераным жыццём. Да гэтага жыцця можна было з лёгкасцю далучыцца, проста выйшаўшы за межы тэрыторыі гатэля. І гэта быў новы раздзел экзатычнай незабыўнай казкі. Чаго вартая была купля сярэбранага бранзалета на кірмашы ў Медыне (гістарычнай частцы горада): мы з гандляром таргаваліся дзве гадзіны, сабраўшы дзясяткі з тры гледачоў, і ўрэшце цана са ста трыццаці долараў была зніжана да трыццаці сямі пад апладысменты ўражаных прысутных. Ці палёт над горадам на дэльтаплане — з вышыні было ўражанне чысцютка-белага колеру ўсіх будынкаў, якія нібы іскрыліся пад гарачым сонцам. Разам з месцічамі мы пілі сапраўдную арабскую каву ў кавярнях, нават спрабавалі курыць кальян. Заўсёды знаходзілі агульную мову — ці то французскую, ці то англійскую. Бачылі: жывуць небагата, але спакойна, і шчыра радуюцца нам усім, бо турысты для многіх — галоўная крыніца даходаў.

Яшчэ ў той казцы былі падарожжа на ўскраек Сахары на джыпе, паездка верхам на драмадэры (так завуцца аднагорбыя вярблюды, і ўтрымацца на ім нават у дыхтоўным сядле, скажу я вам, няпроста). Вёска трагладытаў — «пячорных людзей», якія жывуць у апартаментах, выкапаных проста ў зямлі. Горы Малога Атласа — там Джордж Лукас здымаў «марсіянскі» пейзаж сваіх «Зорных войнаў». Сустрэча ўсходу сонца на былым салёным возеры. Цяпер там пустыня, але соль, якая выступіла на паверхню і набыла ружовы колер пяску, пад першымі промнямі пачынае зззяць і пераліваецца. І ты ідзеш, ідзеш насустрач сонцу па гэтай дыяментавай прасторы, і здаецца, вось-вось убачыш Стваральніка Сусвету... Пасля зноў былі чорныя ночы і блізкія — здаецца, працягні руку і дастанеш — пранізліва-яркія зоркі. І пах язміну, які там больш падобны на нашы півоні. І адчуванне спакою, якім, здавалася, дыхае ўся гэта сагрэтая шчодрым сонцам зямля...

КАЗКІ не стала раптоўна, яна ператварылася ў кашмар, які не даваў заснуць некалькі начэй запар. 26 чэрвеня. Туніс. Горад Сус. Тэрарыст з аўтаматам Калашнікава на пляжы. Сорак забітых, дзясяткі параненых. Той самы горад, той самы гатэль, той самы пляж. Там, дзе дзевяць гадоў назад было адчуванне разняволенага спакойнага палёту...

На бялюткім пяску пляжа — рудыя плямы крыві і целы забітых. Турысты натоўпамі пакідаюць краіну. Бюджэт падлічвае страты: каля сямі мільярдаў долараў — для не самай багатай краіны вельмі значны ўрон. Як напісаў нядаўна ў сецІве тамтэйшы калега, з якім пазнаёмілася на адпачынку: «Туніс ужо не той і, на жаль, ніколі ранейшым не стане»...

У ТЫЯ некалькі бяссонных начэй, калі перад вачыма стаяў расстраляны пляж з маіх казачных успамінаў, думалася шмат аб чым. Пра тое, што фактычна з Туніса, з іх «Язмінавай рэвалюцыі» пачалася «арабская вясна», якая, як скажуць цяпер палітолагі, і спарадзіла тэтых маладых небарак з аўтаматамі, гатовых страляць ва ўсіх без разбору. А тады людзі па закліку ў сацыяльных сетках выйшлі на вуліцу з патрабаваннем... невядома чаго і, галоўнае, змены ўлады. Аўтар першага закіду з заклікам да пратэсту і сёння застаецца невядомым, але і праз гады, калі ўсё раскрыецца, вельмі мала тунісцаў скажуць яму дзякуй. Людзі, спакойныя нармальныя людзі, фактычна самі разбурылі і страцілі сваю краіну, якую яшчэ колькі гадоў таму з гордасцю называлі часткай Еўропы ў Афрыцы. Ахопленыя эйфарыяй натоўпу, гарланячы разам з іншымі «Далоў!», яны наўрад ці нават у страшным сне маглі ўявіць, што праз колькі гадоў людзей будуць страляць сярод белага дня ў музеях і на пляжы, што турысты, якіх яны так песцілі і дзякуючы якім даволі бязбедна жылі, будуць стрымгалоў кідацца да пададзенага трапа самалёта, каб хутчэй з'ехаць адсюль і больш каб нага ніколі не ступала... Апанаваныя нейкай не зусім зразумелай, але дакладна «высакароднай» мэтай, тыя тысячы, што выйшлі на вуліцы зімой 2011-га, вядома ж, не хацелі, каб адбылося тое, што маем сёння. Але, пэўна, многія з іх цяпер задумваюцца, ці не стаў асабіста іх учынак часткай вялікага пускавога механізму, які, спрацаваўшы, прывёў да катастрофы, ад якой церпіць і краіна ўвогуле, і кожны асобны яе жыхар.

РАЗБУРЫЦЬ заўсёды прасцей, чым стварыць. Кінуўшы пад ногі тое, што маеш, набываеш усе шанцы прыйсці да бездані. Вось такая мараль у гэтай казкі, якой не стала.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ На сувязі

# ДЛЯ ЎСІХ — АДЗІН ТАРЫФ

**Абанентам МТС больш не прыйдзецца цікавіцца, паслугамі якога аператара карыстаецца суразмоўца — кампанія першай у Беларусі адмяняе розніцу ў коштах званкоў унутры сеткі і па-за яе межамі.**

З 16 ліпеня змяненні ў тарыфах уступяць у сілу, яны будуць датычыцца ўсіх абанентаў МТС: як старых, так і новых. Новыя правілы актуальныя і для тых, хто карыстаецца так званымі архіўнымі тарыфамі, якія ўжо не прапануюцца новым кліентам.

— На такія змены нас падштурхнула разуменне таго, што рынак мабільных паслуг у Беларусі застаўся, як патрэбныя сур'ёзныя перамены, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе кампаніі. — Мы хочам, каб нашы абаненты адчувалі сябе свабоднымі ў выбары паслуг сувязі, не прыкідвалі ў галаве, колькі ім будзе каштаваць той ці іншы званок.

Для большасці тарыфаў гэта азначае, што кошт зыходзячага званка ўнутры сеткі вырасце, а на тэлефоны іншых аператараў — знізіцца. Адна хвіліна размовы на большасці папулярных планаў цяпер будзе каштаваць 399 або 599 рублёў. Пры гэтым спецыяльныя прапановы захаваюцца, напрыклад, на тарыфным плане «Выдатны» (размова ўнутры сеткі ад пачатку другой хвіліны застанецца бясплатнай). Азнаёміцца з поўным пералікам змен на кожным тарыфе можна на сайце кампаніі.

Трэба заўважыць, што званкі ў замежжа і на кароткія нумары (спецыяльныя даведачныя службы і г.д.) будуць каштаваць па-ранейшаму.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

žoloto by ЮВЕЛИРНАЯ СЕТЬ.ЧАСЫ

Золотая мечта ювелирная сеть

ЦАРСКОЕ ЗОЛОТО ЮВЕЛИРНАЯ СЕТЬ

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «100 нарядов для На100ящего отдыха»

Настоящие Правила проведения рекламной игры «100 нарядов для На100-ящего отдыха», направленной на стимулирование реализации ювелирных изделий из золота и серебра, а также часов (далее – Правила), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 г. № 51, и определяют принципы участия, розыгрыша и получения призов.

## 1. Общие положения.

1.1. Организатор рекламной игры.

Организатором рекламной игры является Частное торговое унитарное предприятие «БигПрайм» (далее – Организатор), УНП 691511104, зарегистрированное на основании решения Молодечненского районного исполнительного комитета от 26.06.2013 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Молодечно, ул. Притыцкого, д. 12, пом. 26.

Почтовый адрес: 220004, г. Минск, ул. Максима Танка, 4.

1.2. Наименование рекламной игры: «100 нарядов для На100ящего отдыха».

1.3. Территория, место и срок проведения рекламной игры.

Территория проведения рекламной игры – ювелирные магазины «Царское золото», «Золотая мечта» и «Zoloto.by» на территории Республики Беларусь:

**Таблица № 1**

| № п/п | Наименование магазинов | Адреса магазинов |
|---|---|---|
| **Частное торговое унитарное предприятие «БелПромСеть»** Республика Беларусь, город Слуцк, улица Ленина, 317а, комн. 14 | | |
| 1. | «Золотая мечта» | г. Борисов, ул. 3-го Интернационала, д. 64 |
| 2. | «Золотая мечта» | г. Гомель, ул. Косарева, д. 18 |
| 3. | «Золотая мечта» | г. Гродно, ул. К.Маркса, д. 11 |
| 4. | «Золотая мечта» | г. Гродно, ул. Космонавтов, д. 81 |
| 5. | «Царское золото» | г. Гродно, ул. Ленина, д. 22 |
| 6. | «Золотая мечта» | г. Минск, ул. Горецкого, д. 2, торговый объект №28 |
| 7. | «Золотая мечта» | г. Минск, ул. Шаранговича, д. 25, помещение №4 |
| 8. | «Золотая мечта» | г. Минск, ул. В.Хоружей, д. 6, пом. 16 |
| 9. | «Золотая мечта» | г. Могилев, ул. Мовчанского, 6, гипермаркет «Гиппо» |
| 10. | «Золотая мечта» | г. Слуцк, ул. Уласовца, д. 4 |
| 11. | «Царское золото» | г. Слуцк, ул. Ленина, д. 124 |
| 12. | «Золотая мечта» | г. Гомель, ул. Сухого, 2 |
| 13. | «Золотая мечта» | г. Слоним, ул. Ершова, д. 58, пом. 105 |
| 14. | «Золотая мечта» | г. Гродно, ул. Советская, д. 18, 2-й этаж |
| 15. | «Золотая мечта» | г. Сморгонь, ул. Я.Коласа, Д. 120А, помещение №42 |
| 16. | «Золотая мечта» | г. Борисов, ул. Чапаева, 8-38 |
| 17. | «Zoloto.by» | г. Слуцк, ул. Ленина, 124-8 |
| 18. | «Золотая мечта» | г. Барановичи, пл. Ленина, д. 1, пом. 125 |
| 19. | «Царское золото» | г. Барановичи, ул. Ленина, д. 9, пом. 21 |
| **Частное торговое унитарное предприятие «Белювелирсервис»** Республика Беларусь, город Минск, улица Максима Танка, 4 | | |
| 20. | «Царское золото» | г. Витебск, ул. Ленина, д. 55, помещение 10 |
| 21. | «Царское золото» | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 59-1 |
| 22. | «Золотая мечта» | г. Речица, ул. Советская, д. 80 |
| 23. | «Царское золото» | г. Речица, ул. Советская, 104 |
| 24. | «Царское золото» | г. Мозырь, ул. Малинина, д. 1а |
| 25. | «Золотая мечта» | г. Лида, ул. Красноармейская, д. 63, пом. 17 |
| 26. | «Золотая мечта» | г. Минск, пр-т Независимости, 154, торговый объект №19 |
| 27. | «Царское золото» | г. Бобруйск, ул. Минская, д. 51 |
| 28. | «Царское золото» | г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 71 |
| 29. | «Золотая мечта» | г. Витебск, шоссе Бешенковичское, д. 3-1, торговый объект № 13 |
| 30. | «Золотая мечта» | г. Витебск, ул. Фрунзе, д. 15-2 |
| 31. | «Золотая мечта» | г. Жлобин, ул. Первомайская, 51, пом. 12 |
| 32. | «Царское золото» | г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 137, пом. 459 |
| 33. | «Золотая мечта» | г. Орша, ул. Ленина, д. 24, пом. 8 |
| 34. | «Золотая мечта» | г. Бобруйск, ул. Минская, 111, пом. №12 |
| 35. | «Царское золото» | г. Брест, ул. Советская, 72 |
| 36. | «Царское золото» | г. Гомель, ул. Победы, 20 |
| 37. | «Золотая мечта» | г. Гомель, ул. Ветковская, 2-3 |
| 38. | «Царское золото» | г. Жлобин, ул. Первомайская, д. 34, пом. 16 |
| 39. | «Царское золото» | г. Минск, ул. Кальварийская, 24, пом. 5 |
| **Частное торговое унитарное предприятие «БигПрайм»** Республика Беларусь, город Молодечно, улица Притыцкого, 12-26 | | |
| 40. | «Золотая мечта» | г. Осиповичи, ул. Сташкевича, 43 |
| 41. | «Царское золото» | г. Молодечно, ул. Притыцкого, 12-26 |
| 42. | «Золотая мечта» | г. Молодечно, ул. Волынца, 7-10 |
| 43. | «Золотая мечта» | г. Молодечно, ул. Притыцкого, 25-2 |
| 44. | «Царское золото» | г. Минск, ул. К.Маркса, 21-34 |
| 45. | «Золотая мечта» | г. Минск, ул. Комсомольская, 9 |
| 46. | «Золотая мечта» | г. Барановичи, ул. Ленина, 7-20 |
| 47. | «Золотая мечта» | г. Калинковичи, ул. Пионерская, 1 |
| 48. | «Царское золото» | г. Минск, ул. П. Глебки, д. 5 |
| 49. | «Царское золото» | Минская обл., г. Борисов, ул. 3-го Интернационала, д. 5 |
| 50. | «Царское золото» | г. Могилев, ул. Первомайская, д. 69 |
| 51. | «Золотая мечта» | г. Минск, пр-т Победителей, 65, помещение №33 |
| 52. | «Золотая мечта» | г. Могилев, ул. Терёхина, д. 9, пом. 119 |
| 53. | «Царское золото» | г. Орша, ул. Комсомольская, 17 |
| **Частное торговое унитарное предприятие «ДжиэМТи Групп»** Республика Беларусь, город Минск, улица Гурского, 37, пом. 5Н, адм. к. 18/6 | | |
| 54. | «Золотая мечта» | г. Жодино, пр-т Ленина, 21/2-1 |
| 55. | «Золотая мечта» | г. Пинск, ул. Первомайская, д. 142-87 |
| 56. | «Золотая мечта» | г. Минск, пр-т. Дзержинского, 126-2 |
| 57. | «Золотая мечта» | г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 185 |
| 58. | «Золотая мечта» | г. Солигорск, ул. Железнодорожная, д. 21А, пом. 4 |
| 59. | «Царское золото» | г. Брест, ул. Московская, д. 273В |
| 60. | «Царское золото» | г. Солигорск, ул. Заслонова, 29, пом. 13 |
| 61. | «Золотая мечта» | г. Минск, пр-т. Партизанский, 182-1 |
| 62. | «Золотая мечта» | г. Минск, ул. Уборевича, 176 |
| 63. | «Царское золото» | г. Гродно, пр-т Я.Купалы, 16А-1, т.о.11 |
| 64. | «Царское золото» | г. Пинск, ул. Ленина, 5 |
| 65. | «Золотая мечта» | г. Минск, ул. Каменногорская, 3 |
| **Торговое частное унитарное предприятие «Залант»** Республика Беларусь, город Минск, улица Максима Танка, 4 | | |
| 66. | «Золотая мечта» | г. Могилев, ул. Ленинская, 50Б |
| 67. | «Золотая мечта» | г. Могилев, ул. Ленинская, 38 |
| 68. | «Золотая мечта» | г. Светлогорск, ул. Ленина, 45а |
| 69. | «Золотая мечта» | г. Солигорск, ул. Ленина, 20, 1 этаж |
| 70. | «Золотая мечта» | г. Брест, ул. Московская, 210, т.о. 57 |
| 71. | «Золотая мечта» | г. Брест, ул. Советская, 104 |
| **Частное торговое унитарное предприятие «Залант Групп»** Республика Беларусь, город Минск, улица Максима Танка, 4 | | |
| 72. | «Царское золото» | г. Островец, ул. Ленинская, 18 |
| 73. | «Царское золото» | г. Гомель, ул. Кирова, 47-2 |
| 74. | «Царское золото» | г. Гродно, ул. Горького, 91-7 |
| 75. | «Царское золото» | г. Волковыск, улица Ленина, 11 |
| 76. | «Царское золото» | г. Минск, пр. Победителей, 84, т.о. 110 |
| 77. | «Царское золото» | г. Мозырь, ул. Пролетарская, 80 |
| 78. | «Царское золото» | г. Полоцк, ул. Ф.Скорины, 17/6, 71 |
| 79. | «Царское золото» | г. Минск, пр. Победителей, 84, т.о. 113 |
| 80. | «Золотая мечта» | г. Минск, пр-т Дзержинского, 91 |
| 81. | «Царское золото» | г. Гомель, ул. Советская, 60 |
| 82. | «Золотая мечта» | г. Солигорск, ул. Заслонова, 29, пом. 10 |
| 83. | «Царское золото» | г. Слоним, ул. Первомайская, 5-1 |
| 84. | «Царское золото» | г. Барановичи, пр-т Советский, д. 2, т.о.14 |
| 85. | «Царское золото» | г. Лида, ул. Советская, 15 – 2 |
| 86. | «Золотая мечта» | г. Гомель, пр. Ленина, 63 |
| 87. | «Царское золото» | г. Полоцк, Вильнюсское шоссе, 1-56 |
| 88. | «Золотая мечта» | г. Минск, пр. Независимости, 3-2 ТЦ «Столица», пом. 208 |
| **Частное торговое унитарное предприятие «ПолоцкПромТорг»** Республика Беларусь, город Полоцк, пр. Ф.Скорины, 35-114 | | |
| 89. | «Золотая мечта» | г. Береза, ул. Ленина, д. 104-1, помещение 9 |
| 90. | «Золотая мечта» | г. Кобрин, ул. Дзержинского, д. 68, пом. 18 |
| 91. | «Золотая мечта» | г. Полоцк, пр-т Ф.Скорины, д. 35 |
| 92. | «Золотая мечта» | г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 3, кв. 4 |
| 93. | «Золотая мечта» | г. Пинск, ул. Ленина, д. 2 |
| 94. | «Царское золото» | г. Солигорск, ул. К.Заслонова, д. 14, кв. 2 |
| 95. | «Царское золото» | г. Минск, ул. Комсомольская, д. 3, 1-й этаж |
| 96. | «Царское золото» | г. Могилев, ул. Ленинская, 32 |
| 97. | «Золотая мечта» | г. Витебск, пр-т Строителей, 15-1 |
| 98. | «Царское золото» | г. Могилев, ул. Первомайская, 48 |
| 99. | «Золотая мечта» | г. Лида, ул. Советская, д. 23-1 |
| 100. | «Царское золото» | г. Минск, пр-т Независимости, 154, торговый объект № 18 |
| 101. | «Золотая мечта» | г. Брест, ш.Варшавское, д. 11-1, помещение №140 |
| 102. | «Царское золото» | г. Минск, пр-т Победителей, 65, торговый объект №12 |
| 103. | «Царское золото» | г. Речица, ул. Пролетарская, 118, помещение №196 |
| 104. | «Царское золото» | г. Минск, ул. Бобруйская, 6-10 |
| 105. | «Царское золото» | г. Бобруйск, ул. Минская, 111, помещение №7 |
| 106. | «Царское золото» | г. Витебск, ул. Кирова, 7/13 |

Срок начала и окончания рекламной игры: начало – 10 июля 2015 г., окончание – 14 сентября 2015 г.

1.4. Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры.

В целях контроля за объективным проведением рекламной игры создается комиссия по проведению рекламной игры (далее – Комиссия), состав которой утверждается Организатором.

1.5. В состав Комиссии входят:

1. Семенцова Кристина Андреевна, начальник отдела маркетинга ЧТУП «БелПромСеть» – председатель Комиссии;
2. Палто Ольга Константиновна, начальник отдела закупок и контроля реализации товара УП «Залант»;
3. Новикова Юлия Сергеевна, главный бухгалтер ЧТУП «БелПромСеть»;
4. Тимошков Алексей Михайлович, менеджер ЧТУП «БигПрайм»;
5. Петрович Евгений Михайлович, менеджер ЧТУП «ПолоцкПромТорг».

Комиссия осуществляет свою деятельность в соответствии с зарегистрированными в установленном порядке Правилами проведения рекламной игры. Заседания Комиссии проводятся по мере необходимости.

Комиссия правомочна принимать решения, если на заседании присутствует большинство ее членов. Решения принимаются путем открытого голосования простым большинством голосов от общего количества членов Комиссии, присутствующих на заседании. В случае равенства голосов за и против принятия решения голос председателя Комиссии или лица, исполняющего его обязанности, является решающим.

Решения Комиссии оформляются протоколом, который подписывается всеми присутствующими на заседании членами Комиссии.

Члены Комиссии обязаны:

- осуществлять контроль за правильностью проведения рекламной игры;
- проводить розыгрыш рекламной игры, заседания Комиссии с оформлением соответствующих протоколов;
- рассматривать возникающие споры при проведении рекламной игры;
- выполнять иные обязанности, необходимые для проведения рекламной игры в соответствии с требованиями законодательства и настоящих Правил.

1.6. Настоящая рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации ювелирных изделий из золота, серебра и часов, реализуемых в ювелирных магазинах «Царское золото», «Золотая мечта», «Zoloto.by».

## 2. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником рекламной игры.

2.1. Участниками рекламной игры могут быть все достигшие совершеннолетия, дееспособные граждане Республики Беларусь и лица, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, выразившие свое желание принять участие в рекламной игре и отвечающие требованиям по ее проведению.

Не допускается участие в рекламной игре членов Комиссии, работников Организатора, а также супруги (супруга) такого лица, его близких родственников, а также лиц, находящихся с таким лицом в отношениях свойства.

2.2. Чтобы стать участником рекламной игры, необходимо в период с 10 июля 2015 г. по 06 августа 2015 г.:

2.2.1. приобрести одно или несколько ювелирных изделий из золота 585 пробы, серебра 925 пробы, часы стоимостью за 1 изделие от 500 000 (пятьсот тысяч) белорусских рублей (далее – товар) в одном либо нескольких ювелирных магазинах «Царское золото», «Золотая мечта», «Zoloto.by» перечень которых приведен в таблице № 1 настоящих Правил.

2.2.2. заполнить анкету (анкеты) на сайте организатора: http://zoloto.by/podarok.html с обязательным заполнением следующих полей:

- имя;
- отчество;
- фамилию;
- дату рождения;
- город проживания;
- номер телефона;
- адрес электронной почты;
- дату покупки;
- модель (артикул) приобретенного товара;
- номер штрих-кода приобретенного товара, указанный на этикетки;
- название торгового объекта, где совершена покупка;
- выбрать источник получения информации об Игре.

2.2.3. Получить уведомление об успешной регистрации участника Игры, которое отражается в диалоговом окне на странице регистрационной формы промо-сайта Организатора.

Один артикул приобретенных товаров одним участником может принимать участие в Игре только один раз. В том случае, если один артикул приобретенных товаров отправлен одним и тем же участником посредством регистрационной формы более одного раза, такой участник с данным артикулом будет учитываться один раз по факту первой отправки.

Регистрация каждого нового артикула осуществляется через заполнение новой регистрационной формы.

Организатор не несет ответственность за ошибки, допущенные участниками Игры, при заполнении регистрационной формы, а также за достоверность указанных в регистрационной форме данных. Регистрация участника Игры на промо-сайте Организатора посредством заполнения формы подтверждает тот факт, что Участник Игры ознакомлен и согласен с предложенными условиями проведения Игры

Покупатель, который приобрел один товар стоимостью от 500 000 белорусских рублей, получает право заполнить одну анкету.

Покупатель, который приобрел несколько товаров стоимостью от 500 000 (пятьсот тысяч) белорусских рублей каждое, получает право заполнить такое количество анкет, которое соответствует количеству приобретенных им товаров, соответствующим условиям настоящей игры.

Заполнение всех полей анкеты покупателем является обязательным. Неправильно или частично заполненные анкеты для участия в розыгрыше рекламной игры приниматься не будут.

2.3. Покупателю необходимо сохранять товарный и кассовый чеки на товар (товары) до окончания рекламной игры.

2.4. Покупатель товара (товаров), отвечающий условиям рекламной игры и выполнивший требования, установленные п.2.2.1-2.2.3. настоящих Правил, становится участником рекламной игры.

## 3. Призовой фонд

3.1. Призовой фонд рекламной игры сформирован за счет собственного имущества. Его размер составляет 20 499 340 (двадцать миллионов четыреста девяносто девять тысяч триста сорок) рублей.

**Таблица № 2**

| Наименование призового фонда | Количество, шт. | Цена 1 комплекта | Всего, в руб. |
|---|---|---|---|
| **№1 – 6:** Комплект: Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 21150-30 (M) мужская | 6 | 194 000 | 1 164 000 |
| **№7 – 10:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 21150-20 (M) мужская | 4 | 204 400 | 817 600 |
| **№11 – 20:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 21150-20 (M) мужская | 10 | 189 950 | 1 899 500 |
| **№21 – 25:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 21150-20 (M) мужская | 5 | 286 000 | 1 430 000 |
| **№26 – 30:** Комплект: Кепка красная 31001-30 Фуфайка красная 21150-30 (M) мужская | 5 | 252 000 | 1 260 000 |
| **№31 – 34:** Комплект: Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская | 4 | 169 400 | 677 600 |
| **№35 – 42:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22160-20 (L) женская | 8 | 169 400 | 1 355 200 |
| **№43 – 46:** Комплект: Кепка красная 31001-30 Фуфайка красная 22160-30 (L) женская | 4 | 169 400 | 677 600 |
| **№47 – 50:** Комплект: Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская | 4 | 203 280 | 813 120 |
| **№51 – 58:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22160-20 (L) женская | 8 | 203 280 | 1 626 240 |
| **№59 – 62:** Комплект: Кепка красная 31001-30 Фуфайка красная 22160-30 (L) женская | 4 | 203 280 | 813 120 |
| **№63 – 72:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22160-20 (M) женская | 10 | 197 460 | 1 974 600 |
| **№73 – 82:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (M) мужская | 10 | 197 460 | 1 974 600 |
| **№83 – 88:** Комплект: Кепка красная 31000-30 Фуфайка красная 22150-30 (M) мужская | 6 | 220 800 | 1 324 800 |
| **№89 – 94:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22150-20 (M) мужская | 6 | 245 280 | 1 471 680 |
| **№95 – 98:** Комплект: Кепка черная 31001-26 Фуфайка черная 22160-26 (L) женская | 4 | 203 280 | 813 120 |
| **№99 – 100:** Комплект: Кепка белая 31001-20 Фуфайка белая 22160-20 (M) женская | 2 | 203 280 | 406 560 |
| **ИТОГО:** | **100** | | **20 499 340** |

## 4. Время и место проведения розыгрыша рекламной игры.

4.1. Розыгрыш пройдет 08 августа 2015 года в 14.00 по адресу: г. Минск, проспект Победителей, 65, магазин «Золотая мечта».

Розыгрыш производится среди всех участников, зарегистрированных на промо-сайте Организатора.

4.2. Розыгрыш призов осуществляется с помощью лототрона.

Информация об участнике Игры, указанная в настоящих Правилах, после заполнения регистрационной формы и отправки данных попадает в административную панель промо-сайта Организатора. В административной панели промо-сайта Организатора каждому участнику Игры присваивается порядковый регистрационный номер начиная от «1» в зависимости от даты и времени его регистрации. Из административной панели данные участников Игры загружаются в файл табличного вида. Из данного файла распечатываются данные об участниках: порядковый номер, фамилия, имя, отчество, номер телефона, заверяются Управляющим Организатора. В день проведения розыгрыша Организатор печатает порядковые номера количеством равным количеству участников рекламной игры. Все номера помещают в лототрон.

Победителями рекламной игры будут признаны 100 (сто) участников, чьи порядковые регистрационные номера будут вытянуты из лототрона.

4.2. По результатам розыгрыша каждому победителю рекламной игры выдается комплект призов, указанные в таблице №1. Комплект приза каждого победителя определяется исходя из порядкового номера вытягивания регистрационного числа из лототрона. ***К примеру, победитель №37 получает комплект приза, указанный в графе таблицы №1 с промежутком №35 – 42***.

Все победители рекламной игры информируются о результатах розыгрыша по контактному телефону и заказным письмом с уведомлением по адресам, указанным им в анкете (анкетах) участника при невозможности дозвониться до победителей, не позднее 22 августа 2015 года.

## 5. Сроки, место и порядок выдачи призов.

5.1. Призы можно будет получить после окончания розыгрыша в магазинах, в которых победители приобретали товары, давшие право участия в розыгрыше настоящей рекламной игры либо обратившись по адресу: г. Минск, ул. М.Танка, 4, до 14 сентября 2015 года с 10.00 до 17.00. Контактный телефон: 8 017 203 00 85.

В случае отказа победителя рекламной игры от приза по каким-либо причинам, выплата ему денежного эквивалента стоимости приза не производится. Не востребованный в течение вышеуказанного срока приз остается в собственности Организатора.

5.2. Для получения приза победителю рекламной игры необходимо будет предоставить паспорт или документ, подтверждающий получение вида на жительство в Республике Беларусь, товарный и кассовый чеки на товар (товары).

Победитель рекламной игры при получении приза обязан заполнить все документы, необходимые Организатору для надлежащего оформления результатов рекламной игры и составления отчетности по результатам рекламной игры, и поставить в них свою подпись.

С момента получения приза у физического лица – победителя рекламной игры возникает обязанность по уплате подоходного налога с суммы приза в налоговом органе по месту его регистрации.

Организатор в установленный законодательством срок с момента выдачи приза направляет сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу физического лица – победителя рекламной игры в налоговый орган по месту его регистрации.

## 6. Порядок информирования об условиях рекламной игры.

6.1. Правила рекламной игры будут опубликованы до начала рекламной игры в газете «Звязда». Также правила рекламной игры и результаты рекламной игры будут размещены на сайтах www.carskoe.by и www.gold-dream.by.

6.2. Результаты рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до 28 августа 2015 года.

6.3. Дополнительную информацию о рекламной игре все желающие могут получить на сайте www.carskoe.by и www.gold-dream.by и по телефону 8(017) 203-00-85 (отдел маркетинга) с 11.00 до 16.00.

## 7. Дополнительные условия.

7.1. Факт участия в рекламной игре подразумевает ознакомление и полное согласие участника с вышеизложенными Правилами.

7.2. Факт участия в рекламной игре также подразумевает, что каждый ее участник соглашается с тем, что в случае, если он станет ее Победителем, его имя, фамилия, отчество, фотографии, интервью и иные материалы о нем могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с рекламной игрой. Победитель также соглашается давать интервью либо сниматься для рекламных материалов, связанных с рекламной игрой, без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на подобные публикации и результаты съемок принадлежат Организатору.

Свидетельство № 2590 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 2 июля 2015 года Министерством торговли Республики Беларусь.

# МОЦ ДАЮЦЬ КАРАНІ

**Гэтую праверaную часам выснову яшчэ раз пацвердзіла тое, што адбывалася ў сценах школы № 205 Маскоўскага раёна Мінска. Сюды на прэзентацыю сваіх музеяў з'ехаліся настаўнікі і юныя гісторыкі-краязнаўцы з пятнаццаці школ раёна.**

Чаму месцам такога мерапрыемства была выбрана гэтая школа? На пытанне адказала **кіраўнік метадычнага аб'яднання кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі раёна Людміла КРЫЛОВІЧ**:

— Гэтая прэзентацыя — чарговая. Сёлета школа №205 прымае краязнаўцаў з нагоды адкрыцця тут паўнавартаснага музея, які назвалі «Спадчыны рысы непаўторныя». З розных школ і гімназій сюды прывезены міні-экспазіцыі — самыя незвычайныя знаходкі, самыя цікавыя вучнёўскія даследчыя работы. Педагогі, кіраўнікі музеяў абмяняюцца вопытам, вучні таксама даведаюцца шмат новага. Напрыклад, сёння ўсіх цікавіць тэма стварэння віртуальных музеяў, магчымасці пераносу ў сеціва багатай інфармацыі, сабранай юнымі гісторыкамі-краязнаўцамі. Але мы бачым, што нельга спыняцца на стварэнні інтэрнэт-версій школьных экспазіцый. Таму ўжо пачалі рыхтаваць адзіны электронны каталог усіх школьных музеяў нашага раёна.

Сапраўды, сучасныя інтэрнэт-тэхналогіі вельмі хутка трапляюць у ціхія музейныя залы. Ды і самі «музейшчыкі» імкнуцца арганізаваць свой пошук так, каб у выніку яшчэ дакладней паказаць мінулае, яшчэ яскравей расказаць пра сучаснасць. На прыкладзе новага музея 205-й школы відаць, што гісторыка-краязнаўчы фармат (а менавіта такі тут вызначаны) дазваляе паспяхова вывучаць падзеі мінулага, этнаграфію, фальклор і вызначаць іх сувязь з нашым часам. А самае галоўнае — рабіць гэта з карысцю для патрыятычнага выхавання моладзі.



Настаўніца Антаніна ЕРМАШЭВІЧ расказвае маленькім гараджанам пра вясковую хату.



На покуці старажытныя абразы пад вясельным ручніком.




Вучні Руслан КАРПОВІЧ і Яўген АКІМАЎ сфатаграфаваліся на памяць з гармонікам, які пабываў на вайне.

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Антаніна Ермашэвіч, якая знаёміла мяне з экспазіцыяй музея, паказала самы новы раздзел экспазіцыі — калекцыю дзіцячых малюнкаў на тэму свята 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Побач з імі выстаўлены матэрыялы, якія школьнікі сабралі пра ветэранаў вайны: фотаздымкі, біяграфічныя даведкі. Пачэснае месца сярод экспанатаў займае гармонік, які пабываў на вайне (асабістая рэч франтавіка Івана Клянцэвіча з вёскі Слабада Хойніцкага раёна).

— А як гармонік з Гомельшчыны трапіў у фонды мінскага школьнага музея? — цікаўлюся ў маёй суразмоўцы і чую, што бацькі многіх вучняў у свой час пераехалі з вёсак і гарадоў, забруджаных у выніку чарнобыльскай катастрофы. Мінула амаль трыццаць гадоў, але ўсе яны беражліва захоўваюць успаміны пра сваю малую радзіму, перадаюць іх дзецям. Так у калекцыі музея з'яўляюцца ўнікальныя рэчы побыту жыхароў розных раёнаў Беларусі. Некаторыя з іх перададзены пад абяцанне не выстаўляць іх у музеі так, як гэтага пажадаў сам уладальнік. Адна старая жанчына падарыла вельмі прыгожы ручнік, якім у сярэдзіне XX стагоддзя былі абгорнуты абразы на яе вяселлі. Гаспадыня хацела, каб памятны ручнік выстаўляўся толькі разам са святымі абразамі. Цяпер адзін з куткоў вялікай музейнай залы выглядае як покуць у вясковай хаце.

Маленькі, але вельмі яскравы факт: памяць — гэта святое!

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.50 | 21.39 | 16.49 |
| Віцебск — | 4.32 | 21.36 | 17.04 |
| Магілёў — | 4.40 | 21.29 | 16.49 |
| Гомель — | 4.46 | 21.17 | 16.31 |
| Гродна — | 5.05 | 21.53 | 16.48 |
| Брэст — | 5.17 | 21.44 | 16.27 |

## Месяц

*Апошняя квадра 8 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.** Іаанны, Марціна.*
***К.** Амеліі, Антона, Віталя, Філіпа.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

## 10 ЛІПЕНЯ

**1900** год — 115 гадоў таму нарадзіўся (вёска Стаўрова, цяпер у Браслаўскім раёне) Пётра Сергіевіч, беларускі жывапісец і графік, мастак-манументаліст. Адукацыю атрымаў у Вольнай школе малюнку і жывапісу ў Вільні. У 1919 годзе паступіў у Акадэмію прыгожых мастацтваў Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя. У 1924—1925 гадах — у Кракаўскай акадэміі мастацтваў. У 1928 годзе вярнуўся ў Вільню, з'яўляўся прыхільнікам і актыўным дзеячам беларускага адраджэння ў 1930-я гады. Творчасці ўласцівыя вобразнасць, эмацыйнасць, цікавасць да самабытнасці беларускай народнай культуры. Спадчына мастака — больш за 600 палотнаў. Найбольшая частка яго карцін знаходзіцца ў Літоўскім музеі мастацтва. Адзінаццаць прац Пётры Сергіевіча захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску, у гістарычна-краязнаўчым музеі ў Браславе; некалькі твораў знаходзіцца ў культурных установах: музеі Янкі Купалы і гісторыка-археалагічным музеі ў Гродне. Астатнія — у прыватных зборах Літвы, Беларусі і Польшчы.



П. Сергіевіч «Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў»).

**1934** год — ЦВК СССР прыняў пастанову «Аб утварэнні агульнасаюзнага Народнага камісарыята ўнутраных спраў», у складзе якога былі створаны галоўныя ўпраўленні дзяржаўнай бяспекі, рабоча-сялянскай міліцыі, памежнай і ўнутранай аховы, пажарнай аховы, папраўча-працоўных лагераў і працоўных пасяленняў. Першым наркамам быў прызначаны Генрых Ягода. Ствараліся так званыя «тройкі» на месцах, якія складаліся з 1-га сакратара абкама або ЦК, начальніка адпаведнага НКУС і пракурора края, вобласці або рэспублікі. Пры Народным камісары ўнутраных спраў СССР арганізоўвалася Асобая нарада, якой давалася права прымяняць у адміністрацыйным парадку ссылку, зняволенне ў папраўча-працоўныя лагеры на тэрмін да пяці гадоў і высылку за межы Саюза ССР. Гэты адміністрацыйны орган надзяляўся судовымі паўнамоцтвамі, што не магло не прывесці да парушэнняў законнасці, правоў грамадзян. Мільёны людзей былі сасланы ў лагеры ГУЛАГа і сотні тысяч прысуджаныя да вышэйшай меры пакарання. У многіх выпадках доказы не мелі асаблівай ролі, дастаткова было ананімнага даносу для арышту. Па сутнасці, НКУС з'яўляўся жорсткім каркасам усёй дзяржаўнай сістэмы краіны ў савецкі час. У 1946 годзе камісарыят быў пераўтвораны ў два ведамствы — Міністэрства ўнутраных спраў СССР і Міністэрства дзяржаўнай бяспекі СССР, паміж якімі і былі падзелены яго функцыі.

**1940** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (г.п. Бягомль Докшыцкага раёна) Ігар Іванавіч Забянькоў, беларускі вучоны ў галіне радыётэхнікі, выдатнік адукацыі Беларусі, доктар тэхнічных навук.

## Было сказана

**Георгій МАРЧУК, пісьменнік, сцэнарыст і драматург:**

*«Для аднаго чалавека набытак — шчасце; для другога страта — шчасце. Усё залежыць ад таго, хто набывае і хто страчвае».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Доктар, гэта вам...**
**— Гэта што?**
**— Мая маленькая падзяка: каньяк, цукеркі...**
**— Паслухайце, а хто вам даў права марнаваць мае грошы?**

У аптэку ў канцы працоўнага дня заходзіць прыгожая дзяўчына ў норкавым футры. Фармацэўт:

— Вы нешта хацелі?

У адказ дзяўчына расхінае футра (пад якім адзення наогул няма!) і кажа:

— Разумееце, я ўжо месяц не бачыла мужчыны...

— Разумею, разумею, вось вазьміце гэтыя кроплі для вачэй...

**Два псіхолагі:**
**— Я ў новага пацыента заўсёды пытаюся, ці гуляе ён у шахматы.**
**— Навошта?**
**— Калі не гуляе — раю гуляць, калі гуляе — раю спыніць.**
**— Чаму?**
**— Чаму — сам не ведаю, але ў 80% выпадках дапамагае.**

Учора стала зразумела, у чым сэнс жыцця... Пра што думаюць жанчыны, пра што марачаць мужчыны, як уладкаваны свет і як усіх зрабіць шчаслівымі... А сёння зноў нічога не зразумела. Сёння пахмелле.



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.783. Індэкс 63850. Зак. № 2748.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 ліпеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12